

ЛЕДЗЯНЫЯ І СНЕЖНЫЯ БУДНІ ДАІ 5

«ДРАЎНЯНАЯ» МАЙСТРЫХА З ЧАШНІЦКАГА РАЁНА 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СЕРАДА № 19 (28886)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«У 2019 годзе Нацыянальны банк працягне прымаць меры па зніжэнні ўзроўню даларызацыі эканомікі механізмамі, якія ў яго ёсць. Вядзецца работа па ўнясенні змяненняў у Грамадзянскі і Банкаўскі кодэксы, ва ўказы кіраўніка дзяржавы ў частцы выключэння выкарыстання ў разліках замежнай валюты, а таксама прывязкі да яе розных тарыфаў. Адначасова дзеянні Нацыянальнага банка будуць накіраваны на фарміраванне новай заканадаўчай базы, якая прадугледжвае знішчэ абмежаванняў на правядзенне валютных аперацый, звязаных з рухам капіталу для фізічных асоб, знішчэ абмежаванняў на адкрыццё рахункаў юрыдычнымі асобамі ў замежных банках і іншае».*

# «Залатая» калекцыя!



Мінскі мастак-канцэптуаліст, сябра Беларускага саюза дызайнераў, вядомы бард і апантаны калекцыянер Сяргей ШЫЛА, акрамя канцэртаў пад гітару і выставачнай дзейнасці, часта ўдзельнічае са сваёй багатай калекцыяй самавараў у гарадскіх і загарадных святах і фестывалях. Сапраўды, такія незвычайныя рэчы могуць упрыгожыць любую святочную пляцоўку! Вось і ў мінулыя выхадныя ў час міжнародных спаборніцтваў, якія праводзіліся ў Лагойскім раёне, апрануўшы свой іміджавы армейскі кажух, Сяргей не толькі дэманстраваў сваю «залатую» калекцыю, але і частаваў гарачай гарбатай з калекцыйнага самавара.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- У Беларусі будзе выдадзена энцыклапедыя пра Уладзіміра Караткевіча.
- **Рэканструкцыя пункту пропуску «Брузгі» ў 2019 годзе завершыцца, у «Каменным Логу» пачнецца.**




- У Гродзенскай вобласці з 2008 года раскрыты ўсе забойствы і факты прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў.
- **У Брэсце падчас будаўнічых работ выяўлена масавае пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Прэм'ера рубрыкі

## ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ

**У сакавіку гэтага года Беларусь чакае адзін са знакавых юбілеяў, на якія багаты 2019-ы. 25 гадоў назад была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Асноўны закон незалежнай дзяржавы. Як і належыць, у ёй былі прапісаны ўсе галоўныя палажэнні дзяржаўнага ўладкавання, і адно з найважнейшых сярод іх — форма праўлення. Упершыню ў Беларусі быў заснаваны інстытут прэзідэнцтва, менавіта Прэзідэнт прызнаваўся кіраўніком краіны. Праз некалькі месяцаў, улетку 1994-га, адбыліся першыя ў гісторыі Беларусі выбары Прэзідэнта. Праходзілі яны ў два туры, у другім туры ўпэўненую перамогу атрымаў Аляксандр Лукашэнка.**

З таго часу мінула дваццаць пяць гадоў — чвэрць стагоддзя. Змянілася краіна, змяніліся дабрабыт і свядомасць яе грамадзян. Змяніліся ў лепшы бок — пра гэта ведаем і мы, гэта заўважаюць і тыя, хто прыязджае сюды праз некалькі гадоў здалёк. Ці было б так, калі б дваццаць пяць гадоў таму парламент абраў іншую форму кіравання краінай, калі б пасады Прэзідэнта у Беларусі ўвогуле не існавала? Пытанне, хутчэй, рытарычнае, бо гісторыя, як вядома, не церпіць умоўнага ладу.

А вось дзейснасць інстытута прэзідэнцтва праз дваццаць пяць гадоў відавочная. Мы вырашылі расказаць аб гэтым на прыкладзе рэалізацыі ў краіне асобных, самых значальных прававых дакументаў, якія паўнамоцны падпісваць менавіта кіраўнік дзяржавы, — указаў, дэкрэтаў, дырэктыў, дзяржпраграм. Героямі нашых публікацый, якія мы мяркуем падрыхтаваць з усіх рэгіёнаў, будуць звычайныя людзі, месцам дзеяння — звычайныя населеныя пункты і прадпрыемствы. Гісторыя дзеецца тут, на нашай зямлі, у нашай непасрэднай прысутнасці і пры нашым удзеле. Чвэрць стагоддзя — гэта нямала для маладой дзяржавы, і разам мы ўжо шмат чаго дасягнулі.

Першая публікацыя рубрыкі прысвечана Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця вёскі.

СТАР. 8–9

Жывіце ў бяспецы!

## СПРАВА ДЛЯ ВАДАЛАЗА

**Напярэдадні Дня ратавальніка, які адзначаўся 19 студзеня, былі вызначаны найлепшыя барацьбіты са стыхіямі ў Беларусі. Сярод іх — і два супрацоўнікі Цэнтра вадалазна-выратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Алег СЦЯПУК і Дзяніс КУЧКО. Працы ім хапае ў любую пару года — і зімой, калі на лёд адпраўляюцца аматары рыбалкі, і ўлетку, калі распачынаецца масавы купальны сезон. Карэспандэнты «Звязды» адправіліся да вадалазаў і даведаліся пра іх службу.**

СТАР. 6



Фота Андрэя САЗОНАВА.

ISSN 1990 - 763X

# КРОПЛЯ КАМЕНЬ КРЫШЫЦЬ

## Мінскі перагаворны працэс хоць і павольна, але робіць сваю справу

**Пра гэта ўчора ішла размова ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з прадстаўніком Украіны ў Трохбаковай кантактнай групе па мірным урэгуляванні сітуацыі ў Данецкай і Луганскай абласцях Яўгенам Марчуком. Дарэчы, сёння, 30 студзеня, у Мінску праходзіць чарговы раўнд перагавораў Трохбаковай кантактнай групы.**

На сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы былі закранутыя самыя розныя пытанні ўзаемадзеяння Беларусі і Украіны. Напачатку прадстаўнік Украіны ў перагаворным працэсе перадаў Аляксандру Лукашэнку цёплае прывітанне ад яго ўкраінскага калегі. «Ён (Пётр Парашэнка. — **«Зв.»**) прасіў перадаць, што задаволены тым, як развіваецца ўкраінска-беларускае супрацоўніцтва, асабліва пасля Форуму рэгіёнаў, і не толькі. Двухбаковая камісія працуе як гадзіннік. Самы, напэўна, найважнейшы паказчык: 18,6 % росту гандлёвага тавараабароту. Гэтаму трэба толькі парадавацца. Супадаюць планы і па павелічэнні гандлёвага абароту: да васьмі мільярдаў долараў праз пару гадоў», — адзначыў Яўген Марчук.

Беларускі лідар удакладніў: «Восем мільярдаў — гэта быў наш найлепшы паказчык, сёння трохі больш за пяць з паловай. Гэта, канешне, не наш узровень. Мы можам больш, і трэба да гэтага імкнуцца».

Суразмоўнікі пазітыўна ацанілі вынікі Першага форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны і пагадзіліся наконт мэтазгоднасці працягваць узаемадзеянне ў такім фармаце. Былі закранутыя тэмы супрацоўніцтва ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці.

Украінскі палітык дадаў, што важна таксама і тое, што сёлета закончыцца дэмаркацыя сухапутнай часткі беларуска-ўкраінскай мяжы, у выніку чаго будуць зняты ўсе непаразуменні.

Удзельнікі сустрэчы абмяняліся думкамі і наконт таго, што зараз адбываецца на ўсходзе Украіны. «Я падзякаваў Аляксандру Рыгоравічу за стварэнне выключна добрых умоў для работы трохбаковай кантактнай групы і ўсіх рабочых груп. Я ўжо чацвёрты год працую ў кантактнай групе і магу ацэньваць усе кампаненты: ад арганізацыйных да чалавечых. Мы адчуваем сябе як дома», — пракаментаваў журналістам асноўную тэму сустрэчы Яўген Марчук.

Ён паведаміў кіраўніку беларускай дзяржавы аб праблемах і адчувальных момантах перагаворнага працэсу. «Асабліва звязана з прыпыненнем агню па ўсёй лініі фронту і самы адчувальны — гэта абмен заложнікамі: хворых на хваробы», — растлумачыў прадстаўнік Украіны.

Каментуючы парадак дня чарговага раўнда перагавораў, ён адзначыў, што так званае «калядное перамір'е» дазволіла вельмі істотна знізіць колькасць абстрэлаў. «На жаль, галоўная перашкода для мірнага ўрэгулявання ліквідавана не цалкам, але гэта добры знак», — сказаў Яўген Марчук.

Ён расказаў, што на чарговай сустрэчы бакі паспрабуюць дасягнуць пагаднення па некаторых пытаннях гуманітарнага характару. Яны датычацца, перш за ўсё, рамонту і аднаўлення аб'ектаў крытычнай інфраструктуры, гэта тыя аб'екты, якія забяспечваюць нармальнае жыццё людзей у так званай прыфрантавой зоне. «Даўжыня лініі судакранання 426 кіламетраў. Ад гэтай лініі на 15, 20, 30, 70 кіламетраў адведзены розныя віды зброі. Але войскі там знаходзяцца адно супраць аднаго. І там пражывае каля 240 тысяч чалавек, у тым ліку некалькі дзясяткаў тысяч малых дзяцей. У гэтых людзей вельмі шмат праблем. Акрамя пакут і пагрозы эпідэмій з-за перыядычнай адсутнасці базавых рэчаў — вады, цяпла, электраэнергіі, захоўваецца і пагроза абстрэлаў. Мінская трохбаковая кантактная група займаецца забеспячэннем умоў для аднаўлення грамадзянскай інфраструктуры ў гэтай зоне», — паведаміў Яўген Марчук.

Прадстаўнік Украіны адзначыў, што пытанняў, па якіх пакуль не ўдаецца дамовіцца, дастаткова шмат, але з вырашэннем праблем эканамічнага характару зрухі ёсць.

Яўген Марчук прааналізаваў, што першым пунктам сённяшняга парадку дня работы Трохбаковай кантактнай групы і рабочай групы па бяспецы будзе пытанне ўсталявання рэжыму цішыні і адвядзення ваенных структур на адлегласць па кіламетры ў кожны бок ад самой лініі судакранання.

На думку прадстаўніка Украіны, Мінскі фармат вельмі карысны. «Калі бакі ваююць адзін супраць аднаго, паміж імі нараджаецца і нарастае вялізны недавер, дамаўляцца становіцца вельмі складана. І калі нам удаецца дамовіцца пра малое, гэта паступова разбурае той велізарны вал недаверу бакоў. Скажам, летам нам удалося дамовіцца пра размініраванне берагоў рэчкі, каб дзеці маглі купацца. Гэта не спыніла вайну, але паміж тымі, хто браў у гэтым удзел, узнікла разуменне пра магчымасць дамаўляцца», — адзначыў ён.

Перагаворнай пляцоўкай для ўрэгулявання сітуацыі на ўсходзе Украіны Мінск стаў з 2014 года. У лютым 2015 года ў беларускай сталіцы падпісаны дакумент аб спыненні баявых дзеянняў і рэалізацыі комплексу мер па выкананні Мінскіх пагадненняў. З вясны 2015 года ў Мінску праводзяцца пасяджэнні рабочых падгруп, якія створаны ў рамках Трохбаковай кантактнай групы.

# САМЫЯ ЦІХІЯ СПАБОРНІЦТВЫ

## Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў падрыхтоўку да Сусветнай шахматнай алімпіяды 2022 года

**Беларусь як арганізатар спартыўных форумаў глабальнага маштабу працягвае набіраць вагу. Чэмпіянат свету па хакеі, чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні, II Еўрапейскія гульні... Ведаеце што стане наступным? Алімпіяда. Сусветная шахматная алімпіяда 2022 года, права правядзення якой мы атрымалі мінулай восенню.**

Гэта ні многа ні мала — падзея планетарнага маштабу, самыя буйныя спаборніцтвы ў свеце шахмат. Пра тое, што гэта дасць Беларусі — размова асобная, але каб нешта атрымаць, трэба ўмець аддаваць. Таму да любых значных падзей важна годна падрыхтавацца. Гэта і стала нагодай для сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі шахмат (ФІДЭ) Аркадзем Дварковічам.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што для яго любы від спорту вельмі важны. «Тым больш Беларусь адна з моцных шахматных дзяржаў, і школа ў нас заўсёды была годная, і зараз ёсць зрухі. Таму гэта наша сустрэча дарэчы, і ёсць магчымасць абмеркаваць планы на будучыню», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў у гатоўнасці аказаць дапамогу пры вырашэнні любых праблем падчас падрыхтоўкі да Алімпіяды.

Каментуючы журналістам змест сустрэчы, Аркадзь Дварковіч сказаў, што напярэдадні буйных спаборніцтваў і іншых мерапрыемстваў, якія пройдуць у Беларусі, а гэта, акрамя Алімпіяды, два Кубкі свету (сярод жанчын і сярод мужчын) і кангрэс ФІДЭ, важна абазначыць прыярытэты развіцця гэтага віду спорту ў краіне. «Гэта датычыцца прасоўвання праекта «шахматы ў школах» — самы важны праект, які павінен ахапіць усе навучальныя ўстановы, размова аб праграме для пачатковых класаў. Наступны ўзровень — шахматная акадэмія, дзе вучацца таленавітыя маладыя людзі. Беларуская Школа (Акадэмія) шахмат ФІДЭ можа стаць адной з найлепшых у свеце. І, вядома, гэта прафесійныя шахматы. Вельмі важна, каб у 2022 годзе беларуская каманда паспяхова выступіла на дамашняй алімпіядзе».

Аляксандр Дварковіч, які з'яўляецца сустаршынёй Фонду развіцця Цэнтра распрацоўкі і камерцыялізацыі новых тэхналогій «Сколкава» (Масква) таксама расказаў Прэзідэнту Беларусі пра работу Фонду «Сколкава», пра яго ўзаемадзеянне з беларускімі партнёрамі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Даведка «Звязды»**

Сусветная шахматная алімпіяда будзе доўжыцца два тыдні, з 1 да 14 жніўня 2022 года. У ёй маюць права браць удзел усе краіны — члены ФІДЭ, такіх цяпер 189. Гэта не толькі ўласна спаборніцтвы, але і вялікая колькасць іншых мерапрыемстваў для дзяцей і юнацтва, якія накіраваны на папулярызацыю шахмат і паднясце ўзроўню шахматыстаў. Падчас алімпіяды пройдзе кангрэс ФІДЭ, на якім адбудуцца чарговыя выбары Прэзідэнта і Прэзідэнцкага савета Міжнароднай федэрацыі шахмат. Восенню 2010 года ў Мінску пройдзе Кубак свету па шахматах сярод жанчын. У жніўні 2021-га — Кубак свету сярод мужчын.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Саудаўская Аравія запусціла нацыянальную праграму прамысловага развіцця



Рэалізацыя маштабнай праграмы абяцае да 2030 года прынесці больш за 1,6 трыльёна рыялаў (438 мільярдаў долараў) інвестыцый у эканоміку краіны, паведаміў на цырымоніі запуску праграмы міністр энергетыкі, прамысловасці і мінеральных рэсурсаў Саудаўскай Аравіі Халід аль-Фаліх. Праграма пад кантролем наследнага прынца Саудаўскай Аравіі Мухамеда бен Салмана разлічана на ўзняцце такіх сектараў эканомікі каралеўства, як энергетыка, нафтахімія, горназдабыўная і аўтамабілебудаўнічая прамысловасць. «Гэтая праграма прадугледжвае павелічэнне долі яе сектараў у ВУП да 1,2 трыльёна рыялаў (каля 320 мільярдаў долараў), з'яўленне 1,6 мільёна новых рабочых месцаў, рост нянафтавага экспарту да больш як трыльёна рыялаў», — сказаў аль-Фаліх, яго выступленне трансляваў саудаўскі тэлеканал «Аль-Іхбарыя».

### У Італіі панізілі пенсійны ўзрост

Прэзідэнт Італіі Серджа Матарэла падпісаў закон аб правядзенні ў краіне пенсійнай рэформы, паведамляе агенцтва ANSA. Адпаведны законапраект быў прыняты парламентам у сярэдзіне студзеня. Паводле яго, у пенсійнай сістэме Італіі ўводзіцца «квота 100». Гэта азначае, што тэрмін выхаду на пенсію зараз будзе вызначацца па формуле: узрост грамадзяніна плюс яго працоўны стаж. У суме гэтыя два паказчыкі павінны даць вынік 100. Адзначаецца, што мінімальны ўзрост выхаду на пенсію складзе 62 гады, у гэтым выпадку стаж павінен быць не менш за 38 гадоў. Па ранейшых правілах, большасць італьянцаў маглі выходзіць на пенсію ў 67 гадоў.



Асобна для жанчын прадугледжана магчымасць датэрміновага выйсці на пенсію ва ўзросце 58—59 гадоў пры наяўнасці 35-гадовага стажу. Асобна агаворана магчымасць датэрміновага выйсці на пенсію пасля дасягнення працоўнага стажу: 41 год і 42 гады працы для жанчын і мужчын адпаведна. Новаўвядзенні пачнуць працаваць для прыватных кампаній з красавіка, а са жніўня — для супрацоўнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў. Таксама закон прадугледжвае ўвядзенне сацыяльных выплат маламаёмасным. Віцэ-прэм'ер, міністр працы і сацыяльнай палітыкі Луіджы Дзі Маё называў прыняцце закона крокам на шляху да пабудовы ў Італіі «дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту».

### Цукерберг мае намер інтэграваць WhatsApp, «Інстаграм» і «Фэйсбук»




Заснавальнік і кіраўнік Facebook Марк Цукерберг мае намер аб'яднаць тэхнічную інфраструктуру сваіх платформаў па абмене паведамленнямі — Messenger, Instagram і WhatsApp. Пра гэта паведаміла The New York Times са спасылкай на крыніцы, знаёмыя з планамі кампаніі. Пасля інтэграцыі яны працягнуць функцыянаваць у якасці асобных праграм, але іх інфраструктура стане агульнай. Змены плануюць унесці да канца 2019 або да пачатку 2020-га. Пасля таго як змяненні ўступяць у сілу, карыстальнік сацыяльнай сеткі «Фэйсбук» зможа пасылаць абароненае паведамленне чалавеку, напрыклад, які мае акаўнт толькі ў WhatsApp. У каментары CNBC прадстаўнік Facebook заявіў, што кампанія засяроджана на прапанаванні хуткіх, простых, надзейных, канфідэнцыйных і бяспечных сэрвісаў па абмене паведамленнямі. Інтэграцыя з'яўляецца рэзкім змяненнем падыходу Цукерберга да сэрвісаў, якім ён абяцаў значную аўтаномнасць у момант іх куплі. Як вядома, Facebook набыла сацыяльную сетку «Інстаграм» за 715 мільёнаў долараў у 2012 годзе, а WhatsApp за $19 млрд — у 2014-м.

# МАСТАЦТВА, ЯКОЕ АБ'ЯДНОЎВАЕ

## У Мінску ўручылі прэмію «Чалавек безбар'ернага асяроддзя — 2019»

**Першымі яе лаўрэатамі сталі кіраўнік хору Алена МАСЛАВА, маладая пісьменніца Сафія ВОРСА і стваральнік літаратурнай серыі твораў невідушчых аўтараў Зоя ПАДЛІПСКАЯ.**


Фота БелТА.

Алена Маслава — стваральнік і кіраўнік адзінага інклюзіўнага хору ў Беларусі «Радасць душы» пры Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт». У ім спяваюць каля 70 удзельнікаў ад 5 да 25 гадоў, з якіх палова — дзеці і маладыя людзі з парушэннем зроку.

— Наш хор — гэта свайго роду клуб, куды прыходзяць, каб мець стасункі, тварыць, — кажа Алена Маслава. — Мы нясём у свет разуменне таго, што дзеці-інваліды — не ўтрыманцы ў грамадстве. Яны многае могуць. Нават самі займаюцца дабрачыннасцю, выступаюць перад сіротамі... Дзецям неабходны вопыт міласэрнасці. Хлопцы і дзяўчаты, якія займаюцца бок у бок з невідушчымі аднагодкамі, рады, што ёсць магчымасць камусьці дапамагчы, накіраваць на кагосьці сваю дабрыню. А для іншых дзетак, асабліва татальна невідушчых, зносіны з іншымі — гэта адкрыццё цэлага свету. Дзякуючы існаванню такога калектыву ў дзяцей з інваліднасцю больш магчымасцяў ездзіць па свеце, праяўляць сябе ў творчасці.

Прэмію атрымала і 15-гадовая беларуская пісьменніца Сафія Ворса. У аповесці «Горад асleплых скрыжаляў» дзяўчына расказала гісторыю кахання невідушчай дзяўчыны. «Некаторы час таму я пазнаёмілася з невідушчай паэткай, яе гісторыя мяне вельмі ўразіла і натхніла на напісанне гэтай кнігі, — падзялілася Сафія Ворса. — Яе гісторыя дапамагае зразумець, што мы ўсе аднолькава думаем, марым, у нас усіх бываюць страхі, памылкі. І зрок тут зусім ні пры чым.

Аповесць ужо намінавана на шэраг міжнародных літаратурных прэмій.

Сярод лаўрэатаў — і галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова», член Саюза пісьменнікаў Беларусі Зоя Падліпская. Прэмія ўручана ёй за стварэнне літаратурнай серыі "Творы сучасных невідушчых аўтараў».

Як паведаміў **кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Іван ГАЛАБУРДА,** далей прэмія будзе пашыраць спектр кірункаў, у якіх працуюць намінанты. Так, ужо цяпер заснавальнікі разглядаюць прэтэндэнтаў на прэмію 2020 года — дзевяць праектаў у сферы тэатра і кіно, музыкі і літаратуры, жывапісу і фатаграфіі.

**Святлана БУСЬКО.**

Пачынаючы з гэтага года прэмія «Чалавек безбар'ернага асяроддзя» будзе штогод прысуджацца дзеячам мастацтва, якія ўнеслі ўклад у прасоўванне прынцыпаў гуманізму і ідэй безбар'ернага асяроддзя для невідушчых і слабавідушчых людзей, а таксама развіваюць інклюзіўнае мастацтва. Яе заснавальнікамі сталі Мінская абласная арганізацыя «БелТІЗ», Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур пры падтрымцы Міністэрства культуры.

# Турнір пакажуць у больш чым 120 краінах

**Дамашні вяшчальнік — кампанія ISB — пацвердзіла інфармацыю аб тым, што ўжо дасягнута пагадненне з кампаніямі, многія з якіх з'яўляюцца вядучымі вяшчальнікамі Еўропы, пра трансляцыю Гульняў на 106 тэрыторыях. Мяркуецца, што аўдыторыя тэлетрансляцый перавысіць 500 мільёнаў гледачоў — ад Афрыкі да Новай Зеландыі.**

*— Гэта выдатная навіна, якая не толькі спрыяе поспеху і запамінальнасці Еўрапейскіх гульняў, але гэта таксама важна для спартсменаў, якія заслугоўваюць увагі вялікай аўдыторыі гледачоў,* — сказаў **прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янез КАЧЫЯНЧЫЧ.** *— Мы з нецярпеннем чакаем магчымасці павітаць увесь свет з Мінска гэтым летам альбо асабіста, альбо з дапамогай нашай вялікай вяшчальнай сеткі.*

Аб'ём вяшчання ISB з II Еўрапейскіх гульняў складзе прыкладна 500 гадзін. На працягу 10 спаборніцкіх дзён кампанія-вяшчальнік будзе весці прамыя трансляцыі падзей, а таксама рыхтаваць зборнікі іх асноўных момантаў. Кампанія таксама будзе трансляваць цырымоніі адкрыцця і закрыцця мультыспартыўнага форуму.

ISB з'яўляецца кампаніяй, прызнанай ва ўсім свеце дзякуючы інавацыям у спартыўным вяшчанні. ISB стала вядучай вяшчальнай структурай для многіх галоўных сусветных спартыўных падзей, у іх ліку сем Алімпійскіх гульняў, шэсць Параалімпійскіх гульняў, шматлікія чэмпіянаты свету і Кубкі свету, а таксама кантынентальныя мерапрыемствы, такія як Панамерыканскія гульні.

*— Мы вельмі задаволены дасягнутымі да цяперашняга часу дамоўленасцямі і спадзяёмся неўзабаве аб'явіць аб шэрагу іншых ключавых пагадненняў,* — сказаў **заснавальнік кампаніі Манола РАМЭРА.** *— Наша канчатковая мэта — гэта дагаворы з больш чым 120 вяшчальнымі кампаніямі, якія валодаюць правамі, і мы ўпэўнены, што дасягнём гэтай мэты.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Гучны выпадак

# Агрэсіўны Джэксан

## У Гродне нападзенне байцоўскага сабакі на хлопчыка выклікала рэзананс

**Зараз гэтую справу разглядае РАУС Кастрычніцкага раёна. Сюды накіравалі заяву з пракуратуры, куды звярнулася маці хлопчыка, якога два тыдні таму пакусаў стафардшырскі тэр'ер.**

Інцыдэнт адбыўся каля пад'езда дома, у якім жыве пацярпелы сямігадовы хлопчык. Калі ён вяртаўся са школы, сустрэў свайго дзесяцігадовага суседа з сабакам. Гадаванец быў на павадку, але без намордніка. Хлопчыкі спыніліся, каб пагаварыць, яны былі знаёмыя. Але праз некаторы час маці малодшага школьніка пачула крыкі. Яна выбегла ў пад'езд і ўбачыла сына з ранамі на твары. Як стала вядома, сабака раптоўна напаў на хлопчыка, яго выратаваў мінак.

Пацярпелага адвезлі ў дзіцячую бальніцу, дзе яму наклалі 10 швоў каля правага вока, вуснаў і падбародка. Па словах медыкаў, хлопчыку пашанцавала, што не пашкоджаны зрок.

Між тым маці хлопчыка напісала заяву ў пракуратуру, адкуль яе накіравалі ў РАУС Кастрычніцкага раёна. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гродзенскага аблвыканкама Ігар БЕЛАЗЁРАЎ,** справа разглядаецца ў рамках крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Зараз вядзецца праверка: апытваюцца сведкі, вызначаецца ступень цяжкасці ўкусаў сабакі, вывучаюцца дакументы і іншае. У хуткім часе будзе дадзена прававая ацэнка ўладальнікам сямімесячнага стафа Джэксана. У кіналагічным цэнтры сабаку пратэсціруюць на агрэсіўнасць, і свой вердыкт вынесуць судмедэксперты. Як стала вядома, сабака не зарэгістраваны ў ЖЭСе, што ўжо з'яўляецца парушэннем заканадаўства. Да таго ж ён гуляў з непаўналетнім хлопчыкам, а таксама без намордніка, што недапушчальна. У Беларусі гэта парода занесена ў спіс патэнцыяльна небяспечных. Такі сабака павінен прайсці абавязковы кіналагічны курс. Але ўладальнікі, як відаць, аб гэтым не ведалі.

Суседзі пачалі збор подпісаў, каб ізаляваць сабаку ад грамадства. Яны гавораць аб тым, што сам гаспадар праяўляе агрэсію да сабакі, а сям'я знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. У сваю чаргу, на бацькоў пацярпелага хлопчыка пачалі сыпацца пагрозы ў сацыяльных сетках.

Ці будзе заведзена крымінальная справа, стане вядома пасля праверкі. Гаспадарам у любым выпадку пагражае штраф за парушэнне правілаў утрымання сабак, наконт астатніх мер пакарання вырашыць суд.

Дарэчы, летась толькі ў Гродзенскай дзіцячай абласной бальніцы было зарэгістравана больш за 100 зваротаў пасля ўкусаў жывёл.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Свая справа

# «Грашовая» і «стратная» гародніна

## Ва ўдзельніц праекта «Прадпрымальная землеўласніца» з'явіліся ментары

**Якую гародніну вырошчваць на продаж больш выгадна? Што патрабуе менш выдаткаў, аднак дае найвялікшую ўраджайнасць? На якой сельгаскультуры можна «прагарэць» і чым лепш рызыкнуць? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні ўдзельніцы сацыяльнага праекта «Прадпрымальная землеўласніца» шукалі на семінары ў Оршы. Крэатыўныя заняткі адбыліся праз тыдзень пасля экскурсіі жанчын па прыватных гаспадарках Брэстчыны, пра што пісала «Звязда», і завяршылі першы этап адукацыйнага курса праекта, разлічанага на год.**


Фота Андрэя САЗОНАВА.

Разам з ментарамі — спецыялістамі, якія дапамагаюць патэнцыйным бізнес-лэдзі асвойваць фінансавую і сельскагаспадарчую граматы, — жанчыны пакуль «зарабляюць» і «страчваюць» на паперы, аднак неўзабаве пачнецца работа на палях. А перад гэтым жанчын чакаюць яшчэ 40 семінараў, на якіх яны спасцігнуць агародную навуку.

Праект разлічаны на тое, каб заахвоціць прыгожую палову на самастойны заробак. Як захавальніца ачага жанчына заўжды занепакоена, каб хапіла грошай на сям'ю, каб з дзецьмі было ўсё добра. Жанчыны такім чынам выступаюць гэткім рухальным пачаткам. Менавіта таму ўхіл у праекце зроблены менавіта на іх. Па першасці ўдзельніцы, дарэчы, не будуць укладваць у праект нічога, акрамя сваёй працы, адзначаюць арганізатары «Прадпрымальнай землеўласніцы».

Самыя актыўныя жанчыны ўжо могуць самі падзяліцца набытымі ведамі з аднавяскоўкамі, сваякамі і знаёмымі і залучыць іх да ўдзелу ў праекце. Нягледзячы на першапачаткова жаночы твар, да ідэі прадпрымальніцтва на зямлі ўжо далучыліся мужы многіх з іх.

— З дапамогай спецыялістаў нашы агародніцы змогуць растлумачыць асаблівасці вядзення бізнесу на зямлі, каб склад удзельнікаў праекта павялічыўся і атрымалася кааперацыя. Мы плануем, што колькасць удзельнікаў дасягне 600 чалавек, — мяркуе **Рыма ЕПУР, выканаўчы дырэктар праекта, генеральны дырэктар «Маладзёжнай сацыяльнай службы».**

Удзельніцы кажуць, што сур'ёзна натхніліся развіваць аграбізнес, бо хочацца зрабіць нешта для сябе і родных.

**Ірына СІДАРОК.**

Аты-баты

# З запасу прызавуць каля 1400 чалавек

**У Беларусі пачалася комплексная праверка баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці злучэнняў і воінскіх часцей Узброеных Сіл. Кіруе ёй начальнік Генеральнага штаба — першы намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Алег Белаконеў. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

Аб'ектамі праверкі стануць органы ваеннага кіравання аператыўнага і тактычнага ўзроўняў, механізаваныя і танкавыя часці, падраздзяленні сіл спецыяльных аперацый, родаў войскаў, тэхнічнага і тылавога забеспячэння. Мяркуецца, што з запасу будзе прызвана каля 1400 чалавек. Дзеянні ўмоўнага праціўніка будуць імітаваць падраздзяленні сіл спецыяльных аперацый.

Праверка скончыцца штабнымі трэніроўкамі і вучэннямі рознага ўзроўню з баявой стральбой.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Здарэнне

# Адзін загінуў, чацвёра паранены

## Гэта вынік начнога ДТЗ у сталіцы

**Пасля дзвюх гадзін ночы кіроўца аўтамабіля «Аўдзі 100», які рухаўся па вуліцы Кабушкіна з боку вуліцы Крупскай, на скрыжаванні з Партызанскім праспектам здзейсніў наезд на аўтамабіль «МАЗ», які спыніўся наперадзе на забараняючы сігнал святлафора.**

Па інфармацыі УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, у выніку ДТЗ транспартныя сродкі атрымалі механічныя пашкоджанні. Пасажыр «аўдзі» загінуў. Тры пасажыры і кіроўца легкавіка былі паранены і ў цяперашні час знаходзяцца ў медыцынскай установе. Кіроўца МАЗа не пацярпеў. Па факце аварыі праводзіцца праверка.

Устаноўлена, што кіроўца «Аўдзі» пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам да сакавіка 2021 года за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АПРАЎДАНАЯ ЖОРСТКАСЦЬ



**Наркотыкі — зло, і дзяржава змагаецца з ім усімі сіламі. І ніхто гэтага не можа адмаўляць. Але аматары «прыгожага» жыцця ўсё роўна знаходзяць магчымасць купляць і прадаваць забароненыя рэчы. Грамадства час ад часу скаланаецца ад гучных спраў, звязаных з наркотыкамі. Ёсць ахвяры, ёсць вінаватыя, ёсць рыдаючыя маці. Дзе мы зараз знаходзімся на гэтым нябачным фронце барацьбы? Паспяхова наступаем або церпім паражэнне? Якія трэба здзейсніць намаганні, каб звесці да мінімуму шкоду ад праклятага зелля? Па тлумачэнні мы звярнуліся да намесніка начальніка 1-га ўпраўлення Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Кацярыны ШЭЛЕГАВАЙ.**

***— Чатыры гады дзейнічае Дэкрэт Прэзідэнта № 6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў». Якіх вынікаў дабіліся праваахоўныя органы, выконваючы палажэнні гэтага дэкрэта?***

— Колькасць зарэгістраваных нарказлачынстваў з 2014 года знізілася на 32,1 працэнта, — паведаміла Кацярына Дзмітрыеўна. — Вельмі значна зменшылася і колькасць выяўленых нарказлачынстваў, учыненых непаўналетнімі або пры іх саўдзеле, — з 332 да 65. Зніжэнне больш чым у пяць разоў! Летась органамі ўнутраных спраў выяўлена больш за тры тысячы злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. Больш за палову з іх звязаны са збытам наркотыкаў, да іх здзяйснення датычны 502 асобы.

Няўхільна падае ўзровень рэцыдыўнай наркзлачыннасці. Толькі ў 2018 годзе яна знізілася амаль на 10 працэнтаў, што прама паказвае на эфектыўнасць заканадаўства, якое прымяняецца ў краіне. Але самае галоўнае, што скарачэнне прапановы сінтэтычных наркотыкаў і актыўная прафілактыка спрыялі захаванню жыцця і здароўя маладога насельніцтва нашай краіны. У тры разы зменшылася колькасць передазіровак наркотыкамі і ў 22 разы — сярод непаўналетніх. Скарацілася колькасць смяротных зыходаў, а сярод непаўналетніх яны не рэгістравалі-ся з 2015-га.

Асобна звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў нашай краіне па звестках ААН на 2015 год зафіксавана 0,3 выпадка перадазіровак са смяротным зыходам на 100 тысяч насельніцтва. Гэта ў 15 разоў менш, чым у Расіі, у 22 разы — у Вялікабрытаніі, у 34 разы — у Эстоніі, і ў 54 разы, чым у ЗША.

***— Поспехі відавочныя. Трэба думаць, няўхільнасць пакарання да тых, хто распаўсюджвае наркотыкі, апраўдала сябе. А можа, улічваючы шматлікія скаргі сваякоў, і ў прыватнасці, ініцыятыўнай групы «Рух маці 328», варта змякчыць ступень гэтай жорсткасці? Усё ж такі, маладыя людзі атрымліваюць вялікія тэрміны за гэтую, як многім здаецца, «дробязь»?***

— Па-першае, маладыя людзі выдатна ведаюць, на што ідуць, — парыруе палкоўнік міліцыі Кацярына Шэлегава. — У нас у краіне няма тых, хто не дасведчаны аб цяжары магчымага пакарання. Па-другое, суд разглядае кожную справу індывідуальна, і ўлічвае ўсе нюансы. Дарэчы, многія з тых, хто атрымліваюць вялікія тэрміны, пападаюцца на захоўванні і гандлі наркотыкамі не першы раз. У кожнага ёсць пэўны вопыт, і на новае злачынства яны ідуць цалкам свядома. Усё гэта, натуральна, улічваецца судом. Кожны атрымлівае тое, што заслугоўвае. У многіх краінах, дарэчы, заканадаўства ў гэтай сферы значна больш жорсткае, чым у нас. Таму змякчаць ступень пакарання няма ніякіх падстаў. Тым больш што яна можа быць зніжана аўтаматычна, па меры таго, як злачынца адбывае тэрмін. Заканадаўствам прадугледжана, што па заканчэнні 2/3 тэрміну, пры ўмове прыкладных паводзін, зняволены адпускаецца на ўмоўна-датэрміновае вызваленне. І такіх выпадкаў шмат.

І потым, ёсць жа і другі бок пытання. Можна ўявіць сабе пакуты бацькоў, чые дзеці загінулі ад ужывання наркотыкаў. А колькі існуе сем'яў, у якіх жывуць нарказалежныя! Гэтыя людзі сталі закладнікамі сітуацыі, з якой вельмі цяжка знайсці выйсце. Іх жыццё — гэта сапраўднае пекла. Але яны не выходзяць на вуліцу, не крычаць аб сваёй бядзе. І мы павінны дапамагчы ім — у першую чаргу.

***— Чаму, нягледзячы на жорсткасць пакарання, усё роўна знаходзяцца тыя, хто выбірае небяспечны бізнес гандлю наркотыкамі? Няўжо настолькі вялікія даходы, што яны гатовыя рызыкаваць сваімі лёсамі?***

— Прыбытак сапраўды немалы. І хуткі, што многіх прываблівае. Але гэта не адзіны матыў, якім кіруюцца злачынцы. Як правіла, амаль усе яны думаюць так: я ж разумней за астатніх, я ўжо сапраўды не пападуся.

**«У нашай краіне, па звестках ААН на 2015 год, зафіксавана 0,3 выпадка перадазіровак са смяротным зыходам на 100 тысяч насельніцтва. Гэта ў 15 разоў менш, чым у Расіі, у 22 разы — у Вялікабрытаніі, і ў 34 разы — у Эстоніі, і ў 54 разы, чым у ЗША».**

***— І памыляюцца?***

— Так, — пацвярджае Кацярына Дзмітрыеўна. — Многія з іх нават не паспяваюць атрымаць грошы за першую «закладку». Паршае, нашы супрацоўнікі маюць вялікі вопыт аператыўнай работы. Па-другое, нам актыўна дапамагае насельніцтва, якое катэгарычна не прымае наркотыкі. Так што шанцаў весці свой «бізнес» працяглы час у такіх «прадпрымальнікаў» няшмат.

***— Але ж не толькі дробныя прадаўцы затрымліваюцца. Праваахоўныя органы рэгулярна выяўляюць буйныя партыі наркотыкаў.***

— Толькі летась з незаконнага абароту канфіскавана амаль 900 кг наркатычных сродкаў і больш за 36,5 кг псіхатропных рэчываў.

***— Адкуль наогул паступае гэтая атрута ў нашу краіну?***

— Асноўнай крыніцай паступлення наркотыкаў на ўнутраны рынак з'яўляюцца каналы міжнароднага наркатрафіку, якія наладжваюцца транснацыянальнай арганізаванай злачыннасцю. У прыватнасці, мараканскі гашыш, марыхуана, лацінаамерыканскі какаін пастаўляюцца з тэрыторыі Еўрасаюза на тэрыторыю ЕАЭС. Галоўным чынам — у Расійскую Федэрацыю, з наступным перамяшчэннем больш дробнымі партыямі ў Беларусь. Пастаўкі мараканскага гашышу на тэрыторыю Еўрасаюза вядуцца транснацыянальнымі наркагрупоўкамі, якія кантралююцца выхадцамі з краін Усходняй Еўропы (Украіны, Малдовы, Літвы). Транзіт ідзе праз тэрыторыю Іспаніі ў любую з краін Еўропы, у тым ліку Расійскую Федэрацыю. Пастаўкі новых псіхатропных рэчываў з Расіі ў нашу краіну ажыццяўляюцца, галоўным чынам, з дапамогай збытавых сетак праз інтэрнэт.

***— Якія віды наркотыкаў вырабляюцца ў самой Беларусі?***

— На нашай тэрыторыі дзе-нідзе яшчэ сустракаюцца дзікарослыя каноплі, якія не заўсёды ўдаецца своечасова выявіць і выкасіць. Наркаманы наведваюць такія мясціны, каб папоўніць свае запасы. У параўнанні з тымі ўзорамі, што вырошчваюцца спецыяльна для вытворчасці наркотыкаў за мяжой, гэтыя каноплі маюць малую колькасць канабіноідаў. Але ўсё ж выкарыстоўваюцца нарказалежнымі. Таксама яны спрабуюць знаходзіць дзікарослы мак. Гэта што датычыцца наркотыкаў расліннага паходжання.

Апошнім часам атрымалі больш шырокае распаўсюджванне сінтэтычныя наркотыкі, такія як ЛСД або альфа-PVP. Яны выраблаюцца ў лабараторыях, куды дастаўляецца неабходнае абсталяванне і рэчывы. Але што датычыцца існавання такіх лабараторый у Беларусі, то гаворка ідзе аб адзінках.

***— Тут таксама адбілася суровасць Дэкрэта № 6?***

— Злачынцы вельмі ўважліва сочаць за тым, якое пакаранне ім пагражае. Цяпер тэндэнцыя такая, што нашы вытворцы сінтэтычных наркотыкаў актыўна перамяшчаюцца ў Расію і іншыя краіны, дзе заканадаўства ў гэтых адносінах значна мякчэйшае, чым у нас.

***— Якая прафілактыка праводзіцца сярод моладзі на тэму небяспекі ўжывання наркатычных сродкаў?***

— Работа ідзе проста каласальная, — горача запэўнівае мяне Кацярына Шэлегава. — І педагогі, і міліцыя, і грамадскія арганізацыі спрабуюць растлумачыць нашым дзецям, што наркотыкі — гэта дрэнна. Не лезьце туды! Педагогі кажуць аб страшнай шкодзе наркотыкаў у школах. Міліцыя са свайго боку тлумачыць, якое пакаранне прадугледжана за парушэнне закона. Грамадскія арганізацыі таксама ўзялі на сябе частку нагрузкі. Праводзяцца семінары, лекцыі, трэнінгі, спартыўныя мерапрыемствы. Усё накіравана на тое, каб заняць дзяцей у вольны час.

Акрамя таго, мы шырока выкарыстоўваем міжнародны вопыт. Напрыклад, у Брэсце адкрыўся Цэнтр нагляднай прафілактыкі — ноу-хау, якое нашы калегі прывезлі з Кітая. І такія цэнтры мы плануем адкрыць па ўсёй Беларусі. Таксама мы супрацоўнічаем з Германіяй, у якой вельмі высокі ўзровень прафілактыкі наркаспажывання сярод моладзі. Ёсць шмат спосабаў данесці патрэбную інфармацыю да аўдыторыі, і ўсе яны выкарыстоўваюцца ў поўнай меры.

***— Калі вярнуцца да Дэкрэта № 6. Ці трэба разумець, што ўзяты дзяржавай курс абраны дакладна і ніякіх паслабленняў у дачыненні да злачынстваў за захоўванне і збыт наркотыкаў чакаць не варта?***

— Закон ёсць закон, і ён павінен выконвацца ў поўным аб'ёме. Але да чалавечага лёсу трэба адносіцца з усёй адказнасцю. Напрыклад, тых, хто ўжывае наркотыкі і з'яўляецца хворым, трэба лячыць і перакончваць. А той, хто распаўсюджвае атруту і робіць з маладых людзей наркаманаў, будзе адказваць па ўсёй строгасці.

## У тэму

### РЭАЛЬНАЯ ДАПАМОГА

**Восенню мінулага года ў Беларусі запрацаваў адзіны інфармацыйны рэсурс «POMOGUT. BY». Унікальны праект створаны па ініцыятыве МУС пры непасрэдным удзеле Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці, Міністэрства аховы здароўя, грамадскіх арганізацый і накіраваны на аказанне практычнай дапамогі людзям, якія сутыкнуліся з праблемай наркаманіі.**




На сайце сабрана актуальная інфармацыя аб метадах барацьбы з гэтай хваробай, размешчаны кантакты арганізацый і медустаноў, якія аказваюць паслугі залежным, сузалежным і асобам, якія знаходзяцца ў стадыі рэмісіі. Тут таксама можна знайсці звесткі аб арганізацыях, гатовых дапамагчы з працаўладкаваннем і рэабілітацыяй.

Акрамя гэтага, партал змяшчае матэрыялы, накіраваныя на прафілактыку ўжывання і распаўсюджвання наркотыкаў сярод дзяцей і моладзі, а таксама адрасаваны ўсім неабыякавым да гэтай праблемы. Кожны ахвотны, запоўніўшы спецыяльную форму на сайце, можа бясплатна атрымаць кансультацыю эксперта па пытаннях, якія яго цікавяць.

Стварэнне праекта ставіць перад сабой мэты прымусіць адмовіцца ад ужывання наркотыкаў. Улічваючы рэкамендацыі прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, на сайце сабралі ўсю інфармацыю, што датычыцца праблемы наркаманіі ў рамках аднаго рэсурсу. Паспрабавалі зрабіць яе даступнай, каб яна стала запатрабаванай для тых, хто ў гэтым мае патрэбу. Асноўная задача рэсурсу — забяспечыць кожнага звесткамі аб той праблеме, якая закранула яго самога альбо яго блізкага. Дапамагчы тым, хто апынуўся адзін на адзін са сваёй бядой.

Найважнейшым кампанентам праекта з'яўляецца кругласутачны кансультацыйны цэнтр, адкрыццё якога адбылося ў кастрычніку 2018 года на базе Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Патэлефанаваўшы па нумары + 375 (017) 311-00-00, можна задаць пытанне кваліфікаванаму спецыялісту call-цэнтра.

Рэсурс развіваецца і становіцца ўсё больш запатрабаваны. У сярэднім за месяц сайт pomogut.by наведвае больш за 1,1 тысячы карыстальнікаў. З пачатку работы кансультацыйнага цэнтра на тэлефонную лінію паступіла больш за 300 званкоў. Больш як 80 асобам аказана неабходная ананімная дапамога.

Дарэчы, сайта, ужо зараз вядзецца распрацоўка другой галіны сайта, якая будзе прысвечана прафілактыцы наркаманіі і злачынстваў сексуальнага характару ў дачыненні да непаўналетніх.

Спецыяльны рэпартаж

# СЛУЖБА НА ДАРОЗЕ

**У грамадскай свядомасці аб работніку ДАІ склалася наступнае меркаванне: стаіць каля дарогі чалавек у форме з паласатым жазлом у руцэ, спыняе машыны і выпісвае штрафы. І гэтым уся яго работа абмяжоўваецца.**



## Шэсць тон медзі

Часткова гэта, магчыма, і праўда. У паўсядзённай службе «на дарозе» супрацоўнікі ДАІ займаюцца руцінай, правяраючы машыны, якія рухаюцца міма іх або знаходзяцца на стаянцы. Усё дакладна. Арганізацыя бяспекі дарожнага руху з'яўляецца галоўным складнікам іх службы, а паколькі аўтамабілі і, па азначэнні, пешаходы непасрэдна ўдзельнічаюць у руху, то яны ўваходзяць у сферу інтарэсаў інспектараў ДАІ.

Але ці такая аднастайная іх праца? Быць можа, у ёй ёсць аспекты, аб якіх мы нічога не ведаем? Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, я звярнуўся ў ДАІ УУС Мінаблвыканкама.

— Вядома, не толькі дзяжурствам на дарогах мы займаемся, — кажа **намеснік начальніка спецпадраздзялення па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху падпалкоўнік міліцыі Віталь МОЛЧАН.** — Мы суправаджаем грузы, а летам — аўтобусы з дзецьмі, якія едуць у лагеры адпачынку. Акрамя таго, даглядаем транспарт на прадмет провозу забароненых прадметаў. Напрыклад, зусім нядаўна спынілі грузавік. З выгляду нічога незвычайнага, дакументы ў парадку. Але кіроўца неяк дзіўна нерваваўся. Пагледзелі ўнутр прычэпа. Стаяць скрынкі, нічога асаблівага, звярнулі ўвагу на адну дэталь: бакавыя барты, абабітыя знутры фанерай, паступова нібы звужаюцца да кабіны. Сталі вывучаць больш уважліва. Аказалася, паміж фанерай і вонкавым тэнтам быў зазор, у якім схавалі ліставую медзь. І яшчэ большы зазор — у паўтара метра — быў зроблены паміж кабінай і пярэднім бортам. Шэсць тон медзі было схавана ў тым грузавіку! І выявілі гэта нашы супрацоўнікі. Дарэчы, падобных выпадкаў нямала.

## Цікавыя іншамаркі

Разам з падпалкоўнікам міліцыі Віталем Молчанам і **старшым інспектарам названага спецпадраздзялення капітанам міліцыі Дзмітрыем ЮРУЦЕМ** мы выязджаем для праверкі пастоў. Мае спадарожнікі не проста едуць з «пункта А ў пункт Б». Яны жыва цікавяцца аўтамабілямі з замежнымі нумарамі. Калі я пытаюся, чым гэта выклікана, мне зноў дае тлумачэнне Віталь Молчан:

— Даволі часта на тэрыторыю Беларусі прыганяюць транспартныя сродкі, якія маюць не вельмі чыстую, а часам адкрыта крымінальную біяграфію. І прадаюць іх тут за параўнальна невысокую цану — абы хутчэй збыць. Нашы грамадзяне купляюць такія тавары, прывабіўшыся прыдатным коштам. Здагадваючыся, што пры пераафармленні аўтамабіля яго могуць «прабіць» у ДАІ і ўсплывуць негатыўныя факты, многія ездзяць і далей на замежных нумарах. Правяраючы падобныя машыны, мы можам устанавіць факт крадзяжу.

Нібы ў працяг тэмы, перад намі аказваецца легкавік «Шэўрале» з расійскімі нумарамі. Мы рухаемся за гэтай машынай. Збочваем у завулкі пасёлка Бараўляны. «Шэўрале» спыняецца, капітан міліцыі Юруць ідзе правяраць дакументы.

**МАЗ, гружаны пяском, спыніўся на абочыне. Але збоку да дарогі прылягаў тоўсты пласт снегу, і цяжкі самазвал адным бокам сцягнула ўніз...**

Кіроўца, нават на мой неспрактыкаваны погляд, неяк залішне мітуслівы. Высвятляецца, што ён грамадзянін Беларусі, але дакументаў на аўтамабіль у яго пры сабе няма. Кажа, пакінуў у іншай машыне. Старшы інспектар Юруць садзіцца да яго, мы з падпалкоўнікам міліцыі Молчанам едзем следам. Прыязджаем да яшчэ адной іншамаркі, але і там няма дакументаў на «Шэўрале». Кіроўца кажа, што дакументы знаходзяцца дома, і ён зараз іх прынясе. Але яго не адпускаюць дадому, мяркуючы, што можа збегчы, і прапаноўваюць патэлефанаваць таму, хто прынясе дакументы. Альбо — праехаць у УУС і там ва ўсім разабрацца. У рэшце рэшт, высвятляецца, што дакументы ў кіроўцы першапачаткова былі пры сабе, але на машыну не афармлена страхоўка, і ўладальнік «Шэўрале», баючыся штрафу, спрабаваў выкруціцца, мяркуючы, што супрацоўнікі ДАІ не будуць такія скрупулёзныя. Памыліўся, і ў выніку быў складзены адміністрацыйны пратакол за адсутнасць страхавога поліса.

— Навошта падманваў? — кажа з дакорам Віталь Молчан, калі мы ўжо паехалі далей. — Зразумела ж было, што мы пра ўсё даведаемся. Вось таму, што многія спрабуюць падмануць супрацоўнікаў міліцыі замест таго, каб сумленна прызнаць віну, міжволі пачынаеш на ўсіх глядзець з падазрэннем.

Мы спыняем яшчэ адну машыну з расійскімі нумарамі, але там усё ў парадку, і мы мірна раз'язджаемся.

— Скажыце, а ці няма дыскрымінацыі ў тым, што вы адмыслова спыняеце аўто з расійскімі нумарамі? — пытаюся я.

— Па-першае, — спакойна адказвае Віталь Молчан, — мы спыняем любыя машыны, якія выклікаюць у нас падазрэнне. І нумары на іх могуць быць розныя. Уявіце, якую важную і добрую справу мы робім: вяртаем маёмасць грамадзянам суседняй краіны. Многія людзі прад'яўляюць да нас прэтэнзіі за залішнюю, як ім здаецца, строгасць. А мала хто ведае, якія задаволеныя і шчаслівыя ўладальнікі аўтамабіляў, калі атрымліваюць назад сваіх «жалезных коней». Многія ўжо і надзею страцілі, а тут такі падарунак! Таму мы нікога спецыяльна не пераследуем, а проста робім сваю работу.

## Дзіцячыя крэслы

Мы выязджаем за горад, дзе каля вёскі Белыя лужы Віталь Молчан правярае сваіх падначаленых. Служба, як гаворыцца, ідзе ў штатным рэжыме.

Далей я далучаюся да экіпажа **старшага інспектара Юрыя СЕЎРУКОВА**, дзе знаходзяцца яшчэ двое супрацоўнікаў, і разам з імі працягваю дзяжурства.

На маё пытанне, што дастаўляе зараз найбольшую праблему, Юрый Сеўрукоў кажа:

— Улічваючы сезон, вядома, «галаўны боль» — гэта шыны. Дарога часта слізкая, тармазны шлях даўжэе, а людзі працягваюць ездзіць на летняй гуме і спадзяюцца так праездзіць усю зіму. А гэта — адна з галоўных крыніц небяспекі. Некаторыя спрабуюць камбінаваць: ставяць зімовыя шыны толькі на пярэднія колы, а заднія пакідаюць у летнім або «дэмісезонным» абутку. Але гэта таксама можа стварыць аварыйную сітуацыю. Таму сочым за коламі ў першую чаргу. Яшчэ, вядома, шмат праблем з пешаходамі. Цямнее рана, а людзі за горадам прывыклі хадзіць па дарозе па сваіх правілах. Часта ідуць не насустрач, а па руху транспарту. Не абазначаюць сябе святлоадбівальнымі элементамі. Пераходзяць дарогу там, дзе ім захочацца. Зноў жа, п'яныя часта становяцца віноўнікамі ДТЗ, выскокваючы на праезную частку, а то і засынаючы проста на ёй. Таму з пешаходамі вядзецца пастаянная прафілактычная работа.

— А цяпер куды мы едзем? — пацікавіўся я, убачыўшы наперадзе школу.

— Праверым машыны на наяўнасць дзіцячых крэслаў, — тлумачыць старшы інспектар Сеўрукоў. — Большасць бацькоў — людзі дысцыплінаваныя, адказныя, і дзяцей возяць у адпаведнасці з правіламі. Але трапляюцца і тыя, хто імі грэбуе. Некаторыя так проста і заяўляюць: маё дзіця, як хачу, так і важу! Ведалі б яны, што адбываецца з непрышпіленымі дзецьмі падчас сутыкнення. Іх шпурляе па ўсім салоне — страшнае відовішча. Калі б гора-бацькі ўбачылі гэта збоку, бягом пабеглі б купляць крэсла.

Мы праязджаем уздоўж шэрагу аўтамабіляў, прыпаркаваных каля школы. Адзін з інспектараў заўважае, што ў легкавой машыне, якая праехала міма нас, дзіця сядзіць не прышпіленае. Разварочваемся, едзем за гэтым аўто. Падаецца гукавы сігнал, і легкавушка паслухмяна збочвае на стаянку.

За рулём — маладая жанчына. Ззаду яе сядзіць дзяўчынка прыкладна сямі гадоў. Ні дзіцячага крэсла, ні бустара — утрымліваючай прылады, у салоне няма. **Інспектар Віктар ЯКУБЧЫК** пачынае выпісваць штраф, адначасова тлумачачы парушальніцы ступень яе віны. Жанчына згодна ківае, твар у яе вінаваты. У сваё апраўданне яна кажа, што ёсць яшчэ «сямейная» машына, адразу з двума дзіцячымі крэсламі. А ў гэтай яна проста выскачыла «па-хуткаму», забраць дачку са школы. На першы раз штраф — 0,5 базавай велічыні. Але калі парушэнне будзе зафіксавана паўторна, штраф складзе ад 2 да 5 базавых велічынь. Зразумела, што танней купіць крэсла, чым «нарывацца на непрыемнасці». Маладая маці ўсё гэта разумее і кажа, што крэсла будзе ўстаноўлена ў машыну неадкладна.

Другі **інспектар, лейтэнант міліцыі Дзмітрый ГАЛАБУРДА,** тым часам паказвае яшчэ адной машыне збочыць на стаянку. Прычына? Кіроўца не быў прышпілены рамянём бяспекі. Таксама выпісваецца штраф і праводзіцца тлумачальная гутарка. Парушальнік згаджаецца: вінаваты, больш не буду. Пры гэтым жыццярадасна размаўляе па тэлефоне: відаць, штраф яго не моцна засмуціў. Аднак жа, аб рамяні бяспекі цяпер ён наўрад ці забудзе.

## Зімовыя сюрпрызы

Едзем далей. Працягваем гаворку.

— Вось зараз пахаладала, многія машыны глухнуць на дарозе, — кажа Юрый Сеўрукоў. — Людзі спыняюцца, уключаюць аварыйныя агні — і часта не ведаюць, што ім рабіць далей. Зіма, ноч, мароз... Да бяды недалёка. Мы прыходзім такім кіроўцам на дапамогу. Выклікаем эвакуатар, дастаўляем пасажыраў у населены пункт, каб не змерзлі. Калі трэба, выклікаем і медыцынскую службу. Многіх людзей такім чынам выратавалі, яны потым пішуць нам падзякі.

Раптам мы рэзка з'язджаем убок і тармозім. Віктар Якубчык выходзіць з машыны, спыняе нейкую дзяўчыну. Што такое? Аказваецца, яна перабегла дарогу ў неналежным месцы. Я і не заўважыў, але ў інспектараў вока на такія рэчы спрактыкаванае.

Раней я звярнуў увагу на тое, як яны глядзяць на дарогу, на праязджаючыя машыны: хутка, учэпіста, як адсочваючы радарам. Вось і гэтую парушальніцу «запеленгавалі» імгненна, і тут жа зрэагавалі.

Інспектар Якубчык, пагаварыўшы з дзяўчынай, адпускае яе. Я цікаўлюся, у чым справа?

— Цяжарная, спяшаецца на абследаванне, — тлумачыць інспектар.

— Яе не сталі штрафаваць?

— Абмежаваліся вуснай заўвагай, — кажа Віктар Якубчык. — Гэтая мера ўнушэння, дарэчы, прадугледжана заканадаўствам.

Паступае паведамленне па радыёстанцыі. Грузавік з'ехаў у кювет, трэба арганізаваць «калідор», пакуль яго будуць выцягваць. Едзем туды.

Сапраўды, МАЗ, гружаны пяском, спыніўся на абочыне. Але збоку да дарогі прылягаў тоўсты пласт снегу, і цяжкі самазвал адным бокам сцягнула ўніз. Засеў моцна, самому не выбрацца. Чакаем, калі прыедуць на дапамогу машыны з арганізацыі, у якой лічыцца МАЗ, што трапіў у пастку. Хутка прыязджаюць два аўтафургоны. Юрый Сеўрукоў пераганяе службовую машыну за грузавікі і спыняе сустрэчныя машыны. Кіроўцы, разумеючы, што затрымліваюць рух на трасе, спяшаюцца. Яны чапляюць МАЗ тросамі адразу за дзве машыны і заднім ходам выцягваюць на дарогу. Уся аперацыя займае не больш за пяць хвілін. «Хвост» ззаду нас выстраіўся не такі ўжо і доўгі. Ледзьве МАЗ аказваецца на дарозе, інспектары даюць сігнал: можна ехаць. Праз хвіліну траса становіцца чыстай. Дакладнасці дзеянняў супрацоўнікаў ДПС можна пазайздросціць.



На гэтым я сваё «дзяжурства» скончыў. А інспектары засталіся несці службу. Няпростую, разнастайную і такую ўсім патрэбную. Не ведаю, якія высновы зрабілі вы, прачытаўшы гэты рэпартаж, а я пераканаўся абсалютна: пакуль гэтыя людзі на дарозе, мы можам адчуваць сябе ў поўнай бяспецы.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУЛАКОЎ.**

# СПРАВА ДЛЯ ВАДАЛАЗА

## «Першага тапельца я дастаў пад гукі салюту»

**Вадалазны спецыяліст старшы лейтэнант унутранай службы Алег СЦЯПУК** працуе ратавальнікам ужо 13 гадоў. З іх «вадалазны» стаж складае восем. Афіцэр скончыў Камандна-інжынерны інстытут па спецыяльнасці «інжынер па папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый». Да таго за плячыма ў яго былі шэсць гадоў Суворaўскага вучылішча. А сёлета яго прызналі найлепшым вадалазам.

— Пачынаў я ў Мінскім раёне камандзірам аддзялення. Пасля перайшоў на пасаду начальніка аддзялення ў часць у Ждановічах. Гэта на беразе Мінскага мора. Адпаведна, адным з патрабаванняў была кваліфікацыя вадалаза. Таму мяне адправілі вучыцца. У Цэнтры я паглядзеў на асабовы склад, тое, як жывуць байцы, і захацелася ўжо перавесціся сюды, балазе была вакансія.

**— Як часта даводзіцца адпраўляцца на выезды?**

— Напрыклад, у мінулы панядзелак відавочца паведаміў, што дзеці катаюцца на льдзіне каля гатэля на праспекце Пераможцаў. Выбраліся мы туды, але пацярпелых мы там не ўбачылі. Ды і той, хто званіў, некуды сышоў. У тым і краевугольная складанасць нашай працы: калі мы прыязджаем на месца, з якога нам паведамілі аб надзвычайнай сітуацыі, і няма сведкі, які нас выклікаў, то застаецца толькі здагадвацца, адбылося тут нешта ці не. А гэта азначае тое, што пачнуцца пошукавыя работы без прывязкі да мясцовасці, якія зацягваюцца на даволі працяглы час.

Калі паступае інфармацыя аб тым, што чалавек патануў, і да воднага аб'екта трэба ехаць даўжэй за паўгадзіны, то з верагоднасцю 99 % мы едзем, на жаль, даставаць тапельца. Я чуў пра выпадак, калі чалавек нібыта правёў больш за 20 хвілін пад вадой і якога пасля ўдалося рэанімаваць. Але калі нават такое і было, то выпадак гэта адзінкавы. Як правіла, пасля пяці хвілін пад вадой без доступу кіслароду ў мозгу чалавека пачынаюцца незваротныя змяненні.

Даводзіцца нам шукаць і рэчавыя доказы для супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў па адпаведных запытах. Як правіла, гэта прылады, якія праходзяць па разнастайных крымінальных справах, — нажы, пісталеты... Даставалі са дна нават ноўтбукі з інфармацыяй.

**— Ці нагадвае дно нашых вадаёмаў сметнік?**

— Там, дзе адпачывае шмат людзей, — безумоўна. Напрыклад, адзін раз я працаваў на дне Чыжоўскага вадасховішча ў Мінску. Калі паглядзець на карту, то яно размешчана каля трох даволі буйных мікрараёнаў. Дык вось, з прафесійнага пункту гледжання гэты вадаём — самы дрэнны. Ходзіш па дне літаральна навобмацак, таму што ён яшчэ і цёмны. А чаго толькі няма на дне! Нашы хлопцы бачылі там батарэі бутэлек, бухты калючага дроту, затопленыя старыя лодкі. А аднойчы там і ўвогуле адбыўся паказальны выпадак. Наш вадалаз неяк на дне вадасховішча ўпёрся ў... сцяну. І вось куды не тыцнецца навобмацак — паўсюль сцяна! Паспрабаваў усплыць па паверхню — і там перашкода. Урэшце, ён выйшаў назад па сігнальным канцы. Мяркуючы па яго апісанні, на дне таго вадасховішча ляжыць пакой або блок ад панэльнага дома...

**А дзе складаней працаваць — у стаячым возеры ці на рацэ?**

— Адразу нельга адказаць адназначна. На ўмовы работы ўплываюць празрыстасць, хуткасць цячэння, засмечанасць дна, шчыльнасць водарасцяў. Добра працаваць на возеры з бачнасцю ў метраў пяць з чыстым пясчаным дном. Але у нас такіх — адзінкі.

**— Што самае складанае для вас?**

— Бачыць блізкіх на беразе. Ведаеце, за столькі гадоў я ўжо прывык не баяцца мёртвых. Але калі бачыш бацькоў дзяцей, сяброў, якія апанаваны горам, але яшчэ міжволі спадзяюцца на шчаслівы зыход... А ты разумееш, што прайшло шмат часу і ніякай надзеі ўжо няма. І назад не перайграеш сітуацыю, як у камп'ютарнай гульні. Мне вось запомніўся мой стартавы пошук. Першага патанулага я дастаў 9 мая 2012 года. Выйшаў з ім на бераг Свіслачы за камвольным камбінатам акурат пад гукі святочнага салюту. А пасля аказалася, што гэты небарака быў сваяком маёй цешчы.

**— А ці даводзіцца вам працаваць на кар'ерах?**

— Вельмі непрыемны вадаём у Мінску на вуліцы Гарэцкага. Летась там патанулі ажно тры чалавекі, прычым двух з іх даставала мая змена. Калі ў натуральным вадаёме вада збольшага адпаліравала дно за тысячагоддзі, то ў кар'еры дно там, дзе калісьці яго прааараў коўш экскаватара, які здабываў там карысныя выкапні. Распрацоўка скончылася, і тэхніка адтуль сышла. Таму рэльеф дна там проста непрадказальны. Ды і сценкі вадаёма няўстойлівыя, паколькі яны не складваліся на працягу доўгага часу. Плюс там назіраецца істотны перапад тэмператур, што можа прывесці да спынення сэрца. Таму не лезьце купацца ў тэхнічныя вадаёмы.

**— Падзяліцеся вопытам, як вы разгружаецеся псіхалагічна?**

— Я заўжды размяжоўваю жыццё на працы і ў сям'і. Тое, што адбываецца тут, я пакідаю на месцы, дадому перажыванні і роздумы не цягну. Акрамя таго, я даўно займаюся падводным паляваннем. І вось гэта — поўная супрацьлегласць нашай рабоце, калі ты застаешся сам-насам з прыродай. Увогуле, падводны свет — гэта як іншая планета. Усё там адбываецца ў поўнай цішыні. І нават дробная рыбка, якая праплывае побач, калі ты займаешся любой работай, прымушае звярнуць на яе ўвагу. Былі выпадкі, калі на падводна-тэхнічным абследаванні вадаскідаў наступалі на самоў вагой кілаграмаў па 50—70. І гэта даволі жорстка, калі з-пад цябе раптам выплывае апора...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




## Жыццё за пачак цыгарэт

Як вядома, цяжка ў вучэнні — лёгка ў баі. **Старшы ратавальнік-вадалаз прапаршчык Дзяніс КУЧКО**, які быў прызнаны найлепшым ратавальнікам-плыўцом, працуе тут ужо дзевяць гадоў. Ён скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт фізічнай культуры і колькі часу працаваў звычайным ратавальнікам-пажарным. Але ўжо быў майстарам спорту па плаванні. Таму і перайшоў на работу ў вадзе, калі з'явілася такая магчымасць. Хоць плаванне і вадалазная справа — гэта два розныя бакі аднаго медаля.

Пытаюся пра тое, чым займаюцца падводныя ратавальнікі ў час, калі не трэба адпраўляцца на баявы выезд.

— Да дзевяці гадзін раніцы ў нас праводзіцца развод дзвюх змен. Мы знаёмімся з аператыўнай абстаноўкай за мінулыя суткі. Затым прымаем тэхніку і адпраўляемся на практычныя заняткі. Мы адпрацоўваем усё, з чым можам сутыкнуцца на выездзе, пачынаючы ад элементарных практыкаванняў накшталт адпрацоўкі рытмічнага дыхання, устойлівасці вадалаза пад вадой і заканчваючы падводна-тэхнічнымі работамі, да якіх адносяцца, напрыклад, рэзка і зварка металу, дрэва. Гадзіна адведзена і на спартыўныя заняткі. Вадалаз павінен знаходзіцца заўжды ў выдатнай фізічнай форме і быць гатовым да таго, што пад вадой давядзецца хадзіць даволі доўга. Справа ў тым, што бачнасць на дне ўлетку ў лепшым выпадку дасягае адлегласці выцягнутай рукі. А наша амуніцыя важыць даволі шмат. Напрыклад, «цяжкае» абсталяванне са шлемам, вядомае з кінафільмаў, пацягне на 72 кілаграмы. Мы часцей карыстаемся аблегчаным варыянтам. Але ўсё роўна, два дзясяткі кілаграмаў там набярэцца дакладна. Натуральна, у вадзе ўсё гэта важыць менш. Але і правесці там давядзецца не пару хвілін. Напрыклад, 15-літровага балона з кіслародам можа хапіць амаль на гадзіну.

**— Які выезд вам запомніўся больш за астатнія?**

— Некалькі гадоў таму мы ездзілі на невялікае возера пад Мінскам шукаць патанулага падлетка. Са слоў аднаго з рыбакоў, хлопец з кімсьці паспрачаўся, што здолее праплысць пад вадой нейкую адлегласць. І паспрачаўся на пачак цыгарэт. Цела хлопца мы знайшлі хутка. Яму было 14—15 гадоў...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**









### У тэму

**— Найлепшыя вадалазы і ратавальнікі-плыўцы вызначаюцца штогод, — кажа начальнік Цэнтра вадалазна-выратавальнай службы Дзяніс САСНОЎСКІ. — У нас ёсць як каманднае, так і асабістае першынство. Тэарэтычныя веды правяраюцца тэсціраваннем. Як паказвае практыка, найлепшымі па прафесіі становяцца супрацоўнікі, якія маюць вялікі досвед баявой работы і ўдзелу ў ранейшых спаборніцтвах і маюць выдатную фізічную і псіхалагічную падрыхтоўку.**

# ПАЭТЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЧАСУ

**У серыі «100 вершаў» выдавецтва «Мастацкая літаратура» пабачыла свет кніга паэзіі, прысвечаная 100-годдзю Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.**

Укладальнік Віктар Шніп пастараўся да кожнага года знайсці адзін верш, які б ілюстраваў час і літаратуру, які б уяўляў сабою эмацыянальны мастацкі дакумент. У зборнік вершаў пра Беларусь «Святло Айчыны» сабраны творы найлепшых паэтаў стагоддзя перамен: ад Міхася Чарота да Міколы Мятліцкага.

Што пісаў у 1919 годзе «чырванакрылы вяшчун», аўтар паэм «Ленін», «Босыя на вогнішчы», «Беларусь лапцюжная», «Карчма» (паэма прысвечана Янку Купалу) у вершы «Звон»?.. «Кінь саромецца мовы сваёй, // Звацъ сябе беларусам пачні, // Папрацуй над сялібай сваёй, // А пасля з ціхатой адпачні!.. // Дык звані моцна, звон, і гудзі, // Сваім гукам глушы увесь край! // Хто шчэ спіць — ты таго разбудзі, // Хто не спіць — тых да працы збірай!» 1920-я гады, першае дзесяцігоддзе станаўлення Савецкай Беларусі, ілюструюць шчырыя паэтычныя творы Уладзіміра Жылкі, Алеся Гурло, Андрэя Александровіча, Цішкі Гартнага, Янкі Купалы, Уладзіміра Дубоўкі, Зінаіды Бандарынай, Міхася Багуна, Юлія Таўбіна, Валерыя Маракова.

«Святло Айчыны», зборнік, які прадаўжае серыю, распачатую кнігамі Міхася Стральцова, Пімена Панчанкі, Яўгеніі Янішчыц, Генадзя Бураўкіна, — сапраўдная паэтычная хрэстаматыя для арганізатараў мастацкіх вечарын, увогуле для выхаваўчай работы. Найперш, зразумела, у агульнаадукацыйнай школе. Дарэчы, хацелася б параіць чытачу сачыць за навінкамі серыі, а выдавецтву «Мастацкая літаратура» — шырэй рэкламаваць паэтычны праект. Ужо сама ідэя выбару толькі 100 вершаў у спадчыне творцаў, якія дзесяцігоддзямі працавалі ў паэзіі, кожны з якіх выдаў мноства кніг, гаворыць пра жаданне ўкладальнікаў, рэдактараў выбраць найлепшае, выбраць тыя вершы, якія вытрымалі выпрабаванне часам.

Дарэчы, на XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая пачне сваю работу ў сталіцы нашай краіны 6 лютага, адна з першых прэзентацый якраз і будзе прысвечана серыі кніг «100 вершаў». Усе, каму не чужым з'яўляецца роднае паэтычнае слова, завітвайце на праспект Пераможцаў, 14. Да сустрэчы!

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ЯК ПРАЙСЦІ Ў БІБЛІЯТЭКУ?

## Адказ на гэта пытанне ведае кожны ў Навабеліцы



Бібліятэкар Дзіяна МАКСІМАВА, загадчыца Святлана ГАРДЗЕЕВА, бібліятэкар Таццяна МАКАРАВА.

**Жыхары зарэчнага раёна Гомеля ўжо цэлае стагоддзе карыстаюцца кніжкамі гэтай бібліятэкі, сёння — філіял № 3 дзяржаўнай установы «Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля».**

Дату афіцыйнага ўтварэння пры савецкай уладзе — 19 студзеня 1919 года — цяпер і лічаць днём нараджэння Навабеліцкай бібліятэкі, якая з 1993 года носіць імя знакамітага беларускага краязнаўца Еўдакіма Раманава.

У час, калі да ведаў рванулі шырокія масы рабочых і сялян, у бібліятэку штодзень наведвалася ад 50 да 150 чалавек, расказвае **архівіст і бібліятэкар Марыя АЛЕЙНІКАВА**:

— Кніжны фонд быў падзелены на два аддзяленні: гарадское і павятовае. Супрацоўнікі гарадскога не толькі абслугоўвалі насельніцтва Навабеліцы, але і рыхтавалі бібліятэчкі-перасоўкі для прадпрыемстваў, дробных саматужнікаў, вайсковых часцей, уладкоўвалі вечары ў фабрычным клубе. У 1925 годзе бібліятэку наведвала больш за паўтары тысячы чытачоў, а кнігі закупляліся за кошт сродкаў саюза хімікаў, губпалітасветы, саюза дрэваапрацоўшчыкаў.

У 1938-м кніжны фонд налічваў ужо больш за 21 тысячу асобнікаў.

У Вялікую Айчынную вайну фонды былі разрабаваныя. Некаторую частку кніг атрымалася адправіць у Казань, адкуль яны не былі вернуты. Іншыя кнігі забралі на захаванне чытачы бібліятэкі. Дзякуючы гэтаму ўстанова мае цяпер асобныя экзэмпляры рарытэтных выданняў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Увогуле ж бібліятэчныя фонды былі знішчаны.

Па меры вызвалення краіны ад нямецкіх акупантаў аднаўлялася і дзейнасць бібліятэк. Навабеліцкая гарадская пачала працаваць 7 снежня 1943 года, праз паўтара тыдня пасля вызвалення Гомеля. У ёй быў абсталяваны куток, дзе на карту штодня наносілася лінія прасоўвання Чырвонай Арміі на Захад.



Пастаянны чытач Валянцін ЖУРАЎСКІ.

У прыстасаванае памяшканне на першым паверсе шматпавярховіка Навабеліцкая бібліятэка пераехала 60 гадоў таму, у 1959 годзе. Інтэр'ер з ляпнінай столі і сёння нагадвае пра тыя гады.

Рашэннем Гомельскага гарвыканкама ў 1993 годзе бібліятэцы было прысвоена імя Еўдакіма Раманава — выдатнага навукоўца, этнографа, фалькларыста, які ў 1855 годзе нарадзіўся ў мястэчку Нова-Беліца Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Навабеліца даўно стала зарэчным раёнам Гомеля. І тут не забываюць пра чалавека, які зрабіў вялікі ўнёсак у гісторыю Беларусі. Дарэчы, усё сваё жыццё Еўдакім Раманаў прысвяціў збіранню і даследаванню матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Пра гэта бібліятэкары з Навабеліцы цяпер нагадваюць пастаянна — на шматлікіх вечарынах, у якіх удзельнічаюць пісьменнікі і паэты, а таксама школьнікі з усяго раёна.

У 2006 годзе на фасадзе будынка Навабеліцкай бібліятэкі была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка Еўдакіму Раманаву.

Сённяшняя **загадчыца філіяла № 3 Святлана ГАРДЗЕЕВА** прыйшла ў гэтую ўстанову ў далёкім дзяцінстве. Смяецца: жыла ў суседнім двары, а кніжкі чытала пад коўдрай з ліхтарыкам:

— Я вучылася ў гомельскай школе № 4 і хадзіла ў дзіцячы аддзел гэтай бібліятэкі. На асабліва папулярныя кніжкі, напрыклад «Тры мушкецёры» Дзюма, была вялізная чарга. Таму чытаць трэба было вельмі хутка. Калі мне аднойчы выдалі прачытаць кнігу братоў Грым, я зразумела, што хачу працаваць у бібліятэцы, — каб так доўга не чакаць свайго шанцу на прачытанне цікавай кніжкі.

— На маёй памяці тут было два асобныя памяшканні бібліятэкі. Пры гэтым пасярэдзіне была пошта з тэлеграфам. У 90-я там размяшчалася камерцыйная крама. Ну а потым, у 2000 годзе, па ініцыятыве адміністрацыі Навабеліцкага раёна нам аддалі гэта памяшканне цалкам. Мы аб'ядналіся і пашырыліся. Цяпер кніжны фонд бібліятэкі налічвае больш як 55 тысяч асобнікаў, а яе супрацоўнікі абслугоўваюць каля чатырох тысяч чытачоў. Мы ўключаны ў адзіную бібліятэчную сістэму горада, а з мінулага года абслугоўваем людзей у аўтаматызаванай праграме. Да таго ж з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі аказваем разнастайныя платныя паслугі насельніцтву.

Святлана Гардзеева кажа, што вяртаецца мода на чытанне менавіта папяровых, а не электронных выданняў:

— Канешне, часцей за ўсё да нас звяртаецца сярэдняе і старэйшае пакаленне. Але ж і моладзь ёсць. У бібліятэку многія прыходзяць з дзецьмі. Спадзяюся, што менавіта за гэтымі чытачамі будучыня.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# «БУКІНІСТ» ВЯРТАЕЦЦА

## Другое жыццё вядомай магілёўскай краме, дзе гандлявалі патрыманай літаратурай, дало прадпрыемства «Белкніга»

**У Магілёве гэта першы гандлёвы аб'ект ад найбуйнейшага ў Беларусі рэалізатара кніжнай прадукцыі. Што прыемна, «Букініст» мае намер пакінуць у сваім асартыменце ўжываныя кнігі. На палічках ужо з'явіліся прынятыя ад ранейшых гаспадароў шматтомнік Стэндаля, кнігі з вершамі Марыны Цвятаевай, Уладзіміра Маякоўскага. У найбліжэйшы час плануецца цалкам запоўніць букіністычны аддзел. Затое новай літаратуры — і мастацкай, і спецыялізаванай, і вучэбнай — на любы густ. Крама працуе з мінулага тыдня, а яе афіцыйная прэзентацыя запланавана на заўтра — 31 студзеня.**

Месца, як той казаў, «зарыбленае». Так сталася, што ў Магілёве кніжныя крамы ў асноўным знаходзяцца ў цэнтральным Ленінскім раёне. Некаторыя нават на адлегласці некалькіх сотняў метраў, а вось Кастрычніцкі раён, або, як у народзе яго называюць, Задняпроўе, адчувае іх дэфіцыт. У былы «Букініст» на Пушкінскім праспекце ездзілі нават з аддаленых куткоў горада. Але ў канцы мінулага года крама абанкруцілася, пакінуўшы тых, хто здаў на рэалізацыю літаратуру, і без кніг, і без грошай. Справамі прыватнага таварыства з дадатковай адказнасцю «Букініст» зараз займаецца эканамічны суд Магілёўскай вобласці. Былыя гандлёвыя плошчы ў доме на Пушкінскім болей не належаць таварыству, але народ пакуль гэтага не ўсвядоміў. Калі на мінулым тыдні на звыклым месцы адкрылася «Белкніга», людзі адразу ж пайшлі высвятляць: ну калі ўжо з намі разлічыцеся?

— Даводзіцца тлумачыць, што гэта не той «букініст», што быў, і адказнасці за былых гаспадароў ён не нясе, — кажа **загадчыца філіяла ААТ «Белкніга» «Кніжная крама «Букініст» Таццяна ПАПКО.**



Крама толькі адкрылася, але пакупнікі ўжо пайшлі.

Рэпутацыя папярэдніка з аднайменнай назвай крыху перашкаджае працаваць, але тут збіраюцца вярнуць прыхільнасць пакупнікоў вялікай разнастайнасцю літаратуры, разважаюць, як зацікавіць аматараў кніг супрацоўніцтвам, вывучаюць попыт. Ужо сёння тут прапануюць кнігі і іншыя спадарожныя тавары, пачынаючы ад стрыжняў і сувенірных нататнікаў і заканчваючы калекцыйнымі талеркамі.

Калектыў падабраўся хоць і малады, але ж вопытны. Нехта працаваў у кнігарнях, нехта ў бібліятэцы. Дзяўчаты добра ведаюць тавар, лёгка арыентуюцца ў літаратуры і выдавецтвах, адразу ж разумеюць, што каму трэба, і могуць падабраць нешта на любы густ.

А выбраць у краме сапраўды ёсць што. Вельмі прыемна было ўбачыць цэлую палічку кніг Выдавецкага дома «Звязда». Шмат беларускамоўнай літаратуры, асабліва дзіцячай. Ёсць нават кнігі для тых, хто нарэшце вырашыў далучыцца да вывучэння роднай мовы, але не ведае, з чаго пачаць. Гэты дапаможнік будзе ім вельмі дарэчы.

Падыходжу да маладых жанчын, якія нешта выбіраюць з дапаможнай літаратуры для школьнікаў.

— Падабаецца, што тут вялікі выбар планаў і канспектаў, — адзначылі яны. — Для першакласнікаў звычайна вельмі мала чаго можна знайсці. А тут вось ёсць, толькі купляйце. Чакаем, што будуць прадавацца кнігі і па акцыях, са зніжкамі.

Вялікія спадзяванні Таццяна Папко ўскладае на букіністычны складнік крамы.

— У Мінску такой літаратуры шмат. Яе бяруць музеі, бібліятэкі. І людзей у такіх аддзелах болей, чым каля новых кніжак. Маладыя маці з задавальненнем купляюць сваім дзецям старыя буквары, кнігі па вывучэнні англійскай мовы. І гэта нягледзячы на тое, што цэны на іх немаленькія. У нас жа ўсё яшчэ толькі пачынаецца.

Гэта не значыць, што тут будуць прымаць усё запар, што ёсць у хатніх бібліятэках. Спачатку папросяць скласці спіс літаратуры, а з яго выберуць найбольш запатрабаванае. І стан папяровага тавару таксама павінен быць добры. Калі тры месяцы на кнігу попыту не будзе, яе ўцэняць, а калі і пасля гэтага не купяць на працягу трох месяцаў, яна вернецца да гаспадара. Супрацоўнікі крамы мараць убачыць больш рарытэтных кніг, напрыклад пачатку XX стагоддзя. Для іх нават прадугледжана спецыяльная шкляная шафа. Спачатку плануецца весці прыём літаратуры кожны дзень, а потым, калі шафы запоўняцца, працэс крыху запаволіцца.

— Пакуль людзі больш пытаюцца, чым здаюць, але ёсць ужо і першыя спісы, — паказвае аркушы, спісаныя дробным почыркам, **адміністратар Алена КОЙПІШ**, якая спецыялізуецца на адборы букіністыкі. — У асноўным мастацкая літаратура, тыповая для чытача савецкага перыяду. Але зацікавілі дзіцячыя аўтары — Іван Бурсаў, Эдуард Успенскі...



З нацыянальным каларытам.

Дарэчы, людзі яшчэ не паспелі здаць кнігі, а першыя пакупнікі ўжо ёсць. З адным з іх мы пазнаёміліся. Віталь Гарбачэўскі хоць і жыве ў іншым раёне горада, але і раней не ленаваўся прыязджаць сюды па тэхнічную літаратуру. На гэты раз па тэме нічога не знайшоў, але ўсё роўна зрабіў пакупкі. «На вочы трапіў «Статут», і стала цікава параўнаць ранейшыя законы з цяперашнімі. Хаця не па гэту кнігу сюды ехаў», — прызнаўся ён. Яшчэ адзін том, які ён набыў, дарэчы, вельмі ўдала, купіў усяго за 5 рублёў, — з аддзела букіністыкі, па гісторыі беларускай кнігі.

— Зараз шмат літаратуры ў электронным выглядзе, і новым гаспадарам крамы вельмі прыдзірліва прыйдзецца падбіраць асартымент, — разважае Віталь. — Тое, што вырашана пакінуць букіністычны аддзел, лічу, вельмі правільны ход. Гэта сапраўды цікава. Да таго ж канкурэнтаў у Магілёве больш няма.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

З гісторыі пытання

# АД РАЗВАЛЕНЫХ КАЛГАСАЎ ДА СТАБІЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК

Як Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі змяніла сітуацыю ў сельскай гаспадарцы Беларусі — і як будзе мяняць яе ў далейшым

## З ЧАГО ЎСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ

У артыкуле «Этапы вялікага шляху», размешчаным на сайце Мінсельгасхарча, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід Заяц нагадвае, што да пачатку 1990-х гадоў Беларусь па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі займала адно з першых месцаў не толькі ў былым Савецкім Саюзе, але і сярод многіх развітых краін Еўропы.

Аднак на пачатковым этапе стварэння суверэннай дзяржавы і станаўлення новай сістэмы гаспадарання адбылося рэзкае падзенне сельгасвытворчасці. Разбурэнне адзінай эканамічнай прасторы СССР пазбавіла Беларусь сыравінных рэсурсаў для вытворчасці азотных і фосфарных угнаенняў, мітавых паставак 3—4 млн тон у год збожжа, усяго асартыменту сродкаў абароны раслін і жывёл, большасці відаў сельскагаспадарчай тэхнікі і паліва для яе.

Да цяжкіх наступстваў для сельскагаспадарчага комплексу прывёў дэмантаж калгасна-саўгаснай вытворчасці. Былі праблемы з кадрамі, упалі паказчыкі, на харчовыя тавары ўвялі карткі... Сітуацыя сапраўды была складанай.

З першых дзён на пасадзе кіраўніка дзяржавы Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу: рынак харчавання павінен быць запоўнены, а народ — накормлены. Пасля яе выканання наша краіна стала прадаваць лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі за мяжу.

## ЗАКЛАСЦІ АСНОВУ

Для таго каб сабраць усе напрацоўкі і задачы ў сельскагаспадарчай сферы, быў патрэбен структураваны дакумент.

У верасні 2003 года Аляксандр Лукашэнка даў наступнае даручэнне: трэба распрацаваць праграму, якая дазволіць узняць аграпрамысловы комплекс нашай краіны на якасна новы ўзровень і зробіць жыццё за межамі горада больш прывабным. Некалькі гадоў спатрэбілася, каб падрыхтаваць паўнавартасны дакумент, у якім дэталёва было раскладзена — што рабіць, як і ў якія тэрміны. Таму вялікай экспертнай групай пачалася распрацоўка Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі, а дакладней, яе першага этапу рэалізацыі — з 2005 да 2010. Яе найважнейшая асаблівасць — маштабнасць.

У сакавіку 2005 года кіраўнік дзяржавы правёў нараду, на якой быў прадстаўлены выніковы праект поўнамаштабнай праграмы (дарэчы, дакумент быў распрацаваны на аснове вынікаў выканання Праграмы ўдасканалення аграпрамысловага комплексу Беларусі на 2001—2005 гады), а яшчэ да гэтага праект па ўказанні Аляксандра Лукашэнкі быў апублікаваны ў СМІ для ўсенароднага абмеркавання. Людзі адрэагавалі на дакумент — прапановы і заўвагі выказвалі не толькі грамадзяне старэйшага ўзросту, але і моладзь. У цэлым можна сказаць, што аднастайна — грамадства ўспрыняло ідэю канструктыўна.

На самой нарадзе беларускі лідар заявіў наступнае:

«Калі мы пачнём інтэнсіўна ажыццяўляць Праграму адраджэння і развіцця вёскі і даб'ёмся яе рэалізацыі, мы закладзём аснову развіцця нашай дзяржавы на многія дзесяцігоддзі, а можа быць, і на стагоддзі. Наша дзяржава заўсёды была моцная вёскай. І яе мы павінны адрадзіць».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў некаторыя тонкасці рэалізацыі праграмы. Паводле яго слоў, ужо тады ў нашай краіне жылі ў яе ўмовах. «Мы зацягнулі яе зацвярджэнне, але дамовіліся, што пад гэтую канцэпцыю і асноўныя яе напрамкі мы павінны будаваць усю палітыку на вёсцы, у тым ліку і фінансавую», — сказаў ён.

Коратка аб галоўных палажэннях і ўмовах, сфармуляваных у дакуменце. Па-першае, на працягу 2005—2010 гадоў было прадугледжана стварэнне 1481 аграгарадка, якія называліся праваднікамі сацыяльных стандартаў. Па-другое, у вытворчай сферы дасягненне да 2010 года запланаваных аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці і яе рэнтабельнасці ў 18—20 % грунтавалася на трынаццаці прыярытэтных кірунках (тэхнічнае перааснашчэнне, меліярацыя зямель і іншыя). Па-трэцяе, праграма вылучалася значнымі аб'ёмамі фінансавання.

## ШТО АТРЫМАЛАСЯ, І ШТО МАЕМ ЦЯПЕР

Пра вынік праграмы красамоўна піша Леанід Заяц:

«У выніку рэалізацыі арганізацыйных мерапрыемстваў праграмы і актывізацыі інавацыйных працэсаў да канца 2010 года ў аграрным комплексе была сфарміравана сучасная інфраструктура галіны [...]. Рэалізаваныя меры далі магчымасць дасягнуць усіх намечаных праграмных пазіцый. Аб'ём валавой прадукцыі ў сельскагаспадарчых арганізацыях і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках павялічаны на 52,7 %. Аграпрамысловы комплекс краіны ў поўнай меры забяспечыў годны ўнутраны харчовы рынак, пашырыў экспарт амаль усіх відаў сельгаспрадукцыі. Аграрны экспарт у 2010 годзе перавысіў 2 млрд долараў».

Закладзеныя ў дакуменце напрамкі развіцця АПК знайшлі працяг у наступных праграмах на 2011—2015 і 2016—2020 гады.

Напярэдадні рашэнне вельмі сур'ёзных задач: вытворчасць малака павінна ўзрасці да 9,2 млн тон, мяса буйной рагатай жывёлы — да 720 млн тон, свіней і птушкі адпаведна да 540 і 615 тысяч тон.

У раслінаводстве да канца 2020 года плануецца павысіць да ўзроўню 2015-га ўраджайнасць збожжавых культур на 9 %, бульбы — на 25 %, агародніны — на 9 %, пладоў і ягад — у 2,5 раза, рапсу — на 31 %, цукровых буракоў — на 51 %, вытворчасць прадукцыі раслінаводства ў гаспадарках усіх катэгорый — на 9,3 %.

...Свет змяняецца — і дзяржаве неабходна хутка і якасна рэагаваць на сучасныя выклікі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разам з павелічэннем сельскагаспадарчых паказчыкаў яшчэ адной задачай з'яўляецца стварэнне вёскі будучага — а гэта выхад на новы ўзровень сацыяльных стандартаў у сельскай мясцовасці.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ВЯСКОВЫ ДУХ

## Калі гавораць Мічурынская, Калі гавораць Брылёва,

**Справа ў тым, што афіцыйная назва аграгарадка, які адносіцца да Красненскага сельсавета Гомельскага раёна, — Мічурынская. Але ж менавіта гэты аграгарадок з'яўляецца цэнтрам славутай на ўсю Беларусь гаспадаркі — КСУП «Брылёва». Таму ў гаворцы жыхары часцей карыстаюцца гэтай назвай, каб абазначыць тэрыторыю, дзе яны жывуць. Магчыма, яшчэ і таму, што Брылёва — гэта вядомы брэнд агародніны, якую тут вырошчваюць і перапрацоўваюць. А яшчэ ўсе ведаюць, што магутную гаспадарку апошнія 40 гадоў узначальвае славуты Герой Сацыялістычнай працы Аркадзь Кобрусеў. Ён з паплечнікамі тут займаўся і стварэннем інфраструктуры, якую да статусу аграгарадка нескладана было ўдасканаліць дзесяць гадоў таму.**

### Усё побач

Трэба адзначыць, што аграгарадок абмежаваны аўтадарогамі і чыгункай. Тэрытарыяльна расці яму няма куды, але гэты факт тут лічаць выклікам, які дае новыя магчымасці. У атачэнні жылых гмахаў Чыгуначнага раёна Гомеля — асаблівая вясковая атмасфера. **Намеснік дырэктара гаспадаркі Любоў КАЗЛОВА** пастаянна падкрэслівае ўзаемаразуменне паміж усімі службамі і падраздзяленнямі, у тым ліку і ўладамі:

— У нас адзінства мэт, падтрымка, узаемадапамога. Калі мы нешта пачынаем рабіць, ёсць адчуванне, што разам зможам усё. Таму колькасць жыхароў у нас пастаянна расце, радка сучасны, а людзям тут жыць камфортна. Калі ў 2006 годзе было прынята рашэнне аб утварэнні аграгарадкоў, то наш па колькасці аб'ектаў быў амаль сфарміраваны. У 2009 годзе з нуля пабудавалі новы спартыўны комплекс.

У яго і заходзім. **Аляксандр БАГДАНАЎ, загадчык філіяла ДЮСШ Гомельскага раёна ў аграгарадку Мічурынская,** паказвае будынак і тое, як ён выглядае знутры: прасторная гульнявая зала, трэнажоры, раздзявальныя пакоі, душавыя:

— Побач знаходзіцца пляцоўка са штучным пакрыццём для міні-футбола. Яе пабудавалі летась. Ёсць і вулічныя трэнажоры. Стаўку робім на выхаванне валейбалістаў і тарыць. Бачыце, як у нас прасторна, — з каляскай можна заехаць. Дарэчы, самаабслугоўванне — як у горадзе. Мы ўсіх сваіх пакупнікоў ведаем. Калі да нас нехта чужы заходзіць, адразу заўважаем. Тут вельмі ціха, спакойна. Няма мітусні і напружання, як у горадзе. Больш даверу паміж людзьмі.

Прадавец прамысловай групы тавараў Настасся Рынгоўская нядаўна стала найлепшай сярод калег у абласным прафесійным конкурсе спажыўкааперацыі — цяпер рыхтуецца прымаць удзел у рэспубліканскім. Увогуле, у гарадку ганарацца людзьмі, якія тут выраслі, вывучыліся, а потым вярнуліся жыць і працаваць. Як, напрыклад, 12 з



Урок гісторыі ў мясцовай школе.

це. Калі дзесяць гадоў таму было 2400, цяпер стала — 2800. І жыллё для людзей будуецца. Жылы фонд налічвае 39 шматкватэрных дамоў і 216 прыватных, ёсць інтэрнат для моладзі. Выдзяляюцца ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва.

Забудова тут дастаткова шчыльная, але ж зусім высокіх дамоў няма. Акуратныя двухі пяціпавярховікі побач з інфраструктурай, да якой — рукой падаць. Тут нават веласіпед не трэба, каб хутка дабрацца да школы, дзіцячага садка, пошты ці крамы. Для людзей гэта, безумоўна, вельмі зручна.

### Трэнажоры для алімпійцаў

— Усё захоўвалася, рэканструявалася, аднаўлялася, будавалася, — працягвае экскурсію Любоў Фёдараўна. — Таму выгляд аграгадзюдаістаў. Таму для іх створаны ўсе ўмовы і з імі працуюць прафесійныя трэнеры. Між тым і дасягненнямі юныя спартсмены радуюць: на міжнародных турнірах увесь час займаюць прызавыя месцы, ёсць чэмпіёны краіны па дзюдо. Чатырох выхаванцаў летась перадалі ў цэнтр алімпійскага рэзерву.

### Крама для стасункаў

Прасторную краму пабудавалі таксама адносна нядаўна ў спальнай частцы аграгарадка.

— Каб, калі забыў нешта адразу купіць, не ленавацца выйсці яшчэ раз, — усміхаецца **загадчыца прадуктовай крамы Юлія ГРАБЕННІКАВА.** — У нашу краму некаторыя па тры разы за дзень прыходзяць. Тут, як у вёсцы: не толькі купляюць тавары, але і збіраюцца, каб проста пагу-

50 настаўнікаў Брылёўскай сярэдняй школы. Яе **дырэктар Ігар СЯЛЮК** ведае некалькі пакаленняў вучняў. Ён сам за 30 гадоў мае адзіны запіс у працоўнай кніжцы.

### Спецыяліст пачынаецца са школы

— Тут стасункі паміж людзьмі іншыя, чым у горадзе. Больш цёплыя, чалавечныя, сяброўскія, сямейныя, можна сказаць. Усе ведаюць адно аднаго і перажываюць, калі што здараецца. Мы знаёмыя з бацькамі кожнага дзіцяці, і гэта нам дапамагае знаходзіць паразуменне. Нашы вучні — высокаматываваныя. Многія з іх вяртаюцца сюды пасля вучобы ў ВНУ. Сярод кваліфікаваных спецыялістаў КСУП «Брылёва» многа нашых выпускнікоў, у дзіцячым садку і амбулаторыі — таксама.

# У АТАЧЭННІ ГМАХАЎ

## маюць на ўвазе Брылёва. маюць на ўвазе Мічурынская

**Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ТКАЧОЎ:**

— У 2009—2011 гадах у Гомельскім раёне было ўладкавана 14 аграгарадкоў. Мічурынская — гэта ўзорны прыклад. Для нас важна, што насельніцтва адсюль не ад'язджае, а, наадварот, імкнецца тут жыць. Дабрабыт людзей расце. Мясцовае прадпрыемства КСУП «Брылёва» аказвае сацыяльную дапамогу. Людзі адчуваюць, што пра іх клапоцяцца. Тут ёсць сувязь паміж кіраўніцтвам прадпрыемства і мясцовымі ўладамі. Мы цяпер імкнёмся падымаць і дробныя населеныя пункты, каб утрымаць людзей на сваёй зямлі. Самае галоўнае — забяспечыць чалавека працай з дастойным заробкам.

Між тым наступнае месца, куды мы зазірнулі, — гэта Брылёўская ўрачэбная амбулаторыя агульнай практыкі. **Загадчыцу Святлану ВЯРШУК** ад пацыентаў адарвалі на хвілінку.

— У нас тыповая амбулаторыя, — кажа Святлана Васілеўна, — пабудаваная ў 1991 годзе. Тут працуюць два ўрачы агульнай практыкі. Кадрамі мы ўкамплектаваныя цалкам, у тым ліку сярэднім персаналам. Усё неабходнае ёсць. Вось цяпер, як і ў горадзе, укараняем электронныя рэцэпты. Важна, што мы ведаем сем'і і спадчынныя хваробы старэйшых пакаленняў. Жыццёвыя сітуацыі таксама на здароўе ўплываюць — і нам пра іх вядома. Тут выйгрышна жыць з пункту гледжання экалогіі: куды менш транспарту, чым у мегаполісах.


У краме аграгарадка.

### З песняй па жыцці

Амаль на самай мяжы аграгарадка з Гомелем — Дом культуры. Ён пабудаваны ў 1965 годзе і дагэтуль знаходзіцца на балансе сельгаспрадпрыемства. КСУП і падтрымлівае яго ў належным стане, адзначае **дырэктар установы Уладзімір СЫБАТАЎ:**

— Такога стаўлення да культуры, як тут, я нідзе не сустракаў. Некалі, 39 гадоў таму, па загадзе кіраўніка гаспадаркі Аркадзя Кобрусева тут стварылі хор «Вязанка». У 1982 годзе ён стаў народным. І цяпер людзі займаюцца ў ім з задавальненнем. Дарэчы, у нас ёсць і вакальна-інструментальны ансамбль, апаратуру для якога закупіла гаспадарка, і танцавальны калектыў «Кросны», і клас харэаграфіі дзіцячай музычнай школы, і гурток дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Фантазія», і глядзельная зала, і бібліятэка...

У Брылёўскай сельскай бібліятэцы гаспадарыць Алена Каратай. Яна гаворыць, што ўстанова камп'ютарызаваная і цалкам адпавядае статусу аграгарадка. Сярод чытачоў шмат тых, хто аддае перавагу беларускай літаратуры.

— Тут вельмі ўтульна, — адзначае Алена Каратай. — Мы жывём сваёй невялікай супольнасцю, адно аднаго ведаем. У нас людзі вельмі добрыя. Мы працуем з усімі падраздзяленнямі і дапамагаем адно аднаму.

А вось 22-гадовы сістэмны адміністратар Павел Гарбенка ў аграгарадок прыходзіць на работу з Гомеля — жыве праз чыгуначныя пуці, але ў горадзе. Ён тут па размеркаванні і, здаецца, крыху зайздросціць мясцовым жыхарам:

— У вялікім горадзе ўсё віруе, а тут жыць вельмі спакойна і прыемна. Для тых, хто сюды прыязджае, ёсць інтэрнат, некаторыя стаяць у чарзе на жыллё. Калі б у мяне была магчымасць, я б тут з задавальненнем жыў, а не толькі працаваў.

### Інтэрнэт самы сучасны

**Васіль БУДНІКАЎ, старшыня Красненскага сельвыканкама,** на тэрыторыі якога знаходзіцца аграгарадок, гаворыць, што дарогі гэтага населенага пункта на 80 % заасфальтаваны:

— Канешне, усе жыхары хочуць, каб было не горш, чым у горадзе. У нас штогод нешта ўводзіцца і будуецца. Тут увогуле няма закінутых будынкаў ці жылля, якое пустуе. Некалькі дэпутатаў сельскага Савета працуюць у Брылёве. Яны таксама спрыяюць рабоце з насельніцтвам. Людзі імкнуцца дапамагаць уладам у навядзенні парадку. Праблемы таксама ўзнікаюць. Былі скаргі на дрэнную тэлефанію і інтэрнэт. Цяпер паўсюль праклалі оптаваланко. Актуальнае пытанне — якасць вады. У Красненскім сельсавеце частка населеных пунктаў, якія прылягаюць да горада, ужо перападключаны да сеткі водаканала Гомеля, у астатніх, у тым ліку ў аграгарадку Мічурынская, шукаем магчымасці для вырашэння гэтай праблемы.

Карцінка не будзе поўнай, калі не сказаць пра нядаўна пабудаваную праваслаўную царкву ў гонар Казанскай іконы Божай Маці. Між іншым, кожны супрацоўнік гаспадаркі пералічваў месячны заробак на яе будаўніцтва. Цяпер у храме моляцца не толькі мясцовыя. Вернікі сюды прыходзяць у тым ліку з Гомеля — не толькі на службы, але і на занятки для дзяцей і дарослых у нядзельную школу.

На балансе гаспадаркі КСУП «Брылёва» ў аграгарадку існуюць яшчэ і кавярня-сталовая, лазнева-пральны камбінат, а хутка з'явіцца і свой музей. Так, у будынку былой крамы размесціцца экспазіцыя, якая будзе расказваць пра слаўтыя дасягненні жыхароў аграгарадка Мічурынская.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Аграгарадок Мічурынская.


## Каментарый у тэму

### Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы Яўген АДАМЕНКА:



— Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі дала моцны штуршок развіццю сельскай гаспадаркі нашай краіны. Толькі на працягу першага этапу — з 2005-га да 2010 года агульны аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі ў грашовым вымярэнні павялічыўся больш чым у чатыры разы, гэтакі ж рост прадукцыі адбыўся і ў разліку на душу насельніцтва. Выраслі валавы збор і ўраджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур, колькасць жывёл, вытворчасць малака, сярэдні ўдой, прыбаўленне жывёлы ў вазе, прыбытак і рэнтабельнасць, экспарт, а таксама спажыванне айчынных прадуктаў харчавання і іх рэсурсы. Выраслі і заробкі работнікаў сельскай гаспадаркі.

Асноўныя мерапрыемствы праграмы былі згрупаваны па двух асноўных кірунках: сацыяльная і вытворчая сферы. Першая мела на ўвазе павышэнне жыццёвага ўзроўню аграрыяў, удасканаленне інфраструктуры вёсак, развіццё жыллёвага будаўніцтва, камунальнага абслугоўвання, мадэрнізацыю дарог, развіццё адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту, сферы паслуг. Другая — удасканаленне спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання зямель, развіццё буйных вытворчасцяў, фермерства, асабістых гаспадарак, перапрацоўку, замацаванне кадраў, забяспечанасць тэхнікай.

Толькі ў сельскай гаспадарцы маладыя сем'і атрымалі магчымасць адразу пасля ВНУ мець жыллё. У многіх населеных пунктах, якія набылі статус аграгарадкоў, упершыню з'явіліся пошта і банк, былі рэканструяваны дзіцячыя садкі, магазіны, школы, адрадзіліся комплексна-прыёмныя пункты, адкрыліся закрытыя раней камбінаты бытавога абслугоўвання. У пашпарце аграгарадкоў дакладна было прапісана, колькі дарог павінна быць з цвёрдым пакрыццём, колькі — з палепшаным, колькі ліхтароў павінны асвятляць вуліцы... І гэта ўсё было выканана.

Вясной мінулага года Прэзідэнт на нарадзе па развіцці сельскай гаспадаркі паставіў чарговую задачу — стварэнне вёскі будучыні, жыццё ў якой ні ў чым не павінна саступаць гарадскому. Былі вызначаны шэсць аграгарадкоў, якія паслужаць узорам: Астрамечава ў Брэсцкай вобласці, Копысь — у Віцебскай, Ляскавічы — у Гомельскай, Абухава — у Гродзенскай, Малыя Славені — у Магілёўскай, Сноў — у Мінскай. Вёска будучыні — гэта ўжо не проста наяўнасць усяго неабходнага для жыцця і работы, але і забяспечанасць новага ўзроўню сацыяльных стандартаў — работа з высокім заробкам, басейн, кінатэатр, музей...

Міграцыя насельніцтва з вёскі ў горад — працэс натуральны, урбанізацыя адбываецца ва ўсім свеце, але і сама вёска становіцца іншай, і работа селяніна кардынальна змяняецца. Прыходзяць новыя, больш эфектыўныя тэхналогіі, якія не патрабуюць ужо ранейшай колькасці чалавечых рэсурсаў. Разам з тым узнікае патрэба ў развіцці сферы паслуг на вёсцы, і працоўная сіла перацякае сюды: утрыманне інфраструктуры, трэнерства, дадатковая адукацыя, дапамога старэйшаму пакаленню, развіццё культурнай спадчыны, прыём турыстаў.

Да нас зараз прыязджаюць замежныя дэлегацыі і выказваюць захапленне дасягнутым узроўнем развіцця сельскай гаспадаркі і ўзроўнем камфорту сельскіх жыхароў. Многія жадаюць пераняць беларускі вопыт, скарыстацца нашымі тэхналогіямі, запрашаюць нашых спецыялістаў.

Вельмі каштоўнае ў праграме тое, што дзяржава, калі робіць стаўку на буйныя вытворчасці поўнага цыкла, не забывае і пра вёсачкі, у якіх засталося па некалькі жылых дамоў. У такіх населеных пунктах створаны ўмовы для развіцця фермерскіх гаспадарак, турызму, прыватнага бізнесу.

Можна сказаць, што Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі ўдыхнула ў сельскую гаспадарку краіны новае жыццё, яна цалкам апраўдала сваю назву.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Запрашальнік

# ДЫНАСТЫЯ МАСЛЕНІКАВЫХ

**5 лютага а 17-й гадзіне ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адбудзецца адкрыццё выстаўкі «Сямейны альбом», прысвечанай 105-годдзю Паўла Масленікава. Цікава, што ўбачыць там можна будзе не толькі яго работы, але яшчэ і карціны сына і ўнука.**



Масленікавы — вядомая дынастыя беларускіх жывапісцаў. Сваю творчасць яны прысвячаюць роднай Беларусі, апяваючы яе веліч і прыгажосць. Бязмежныя прасторы, блакітныя азёры ў работах мастакоў чаргуюцца з ціхімі ўтульнымі куткамі прыроды, у якіх чалавеку хочацца схавацца ад шуму гарадскіх вуліц і паўсядзённай мітусні.

Натхнёная роднай прыродай творчасць мастакоў змяшчае ў сабе па-сапраўднаму нацыянальныя рысы і асаблівасці. Родапачынальнікам дынастыі стаў Павел Масленікаў (1914—1995). Яго творчая актыўнасць паўплывала на развіццё пейзажнага жанру ў беларускім выяўленчым мастацтве, а грамадская дзейнасць зрабіла значны ўклад у станаўленне Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і развіццё беларускага мастацтвазнаўства (працаваў рэктарам з 1960 да 1964 года). Яшчэ ў раннім дзяцінстве будучы мастак уважліва вывучаў родную прыроду. Нягледзячы на тое, што ў беларускім выяўленчым мастацтве пасляваенных дзесяцігоддзяў найважнейшым жанрам была тэматычная карціна, гэты аўтар на працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці захоўваў вернасць галоўнай любові — пейзажнаму жанру, не перастаючы пісаць эцюды. У 1997 годзе Магілёўскаму абласному мастацкаму музею было прысвоена імя Масленікава.

Любоў да прыроды творца перадаў сыну Уладзіміру, які цяпер працуе загадчыкам кафедры жывапісу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Гэты мастак па-свойму лёгка і нязмушана стварае поўныя святла і паветра панарамы і пейзажы. З не меншай цікавасцю Уладзімір ставіцца і да партрэта, у які пераносіць эмацыянальны зарад прыродных сіл, надзяляючы мадэлі пазітыўнай энергетыкай і пачуццём міру.

Унук Паўла Масленікава — таксама Павел — як і яго бацька, з дзяцінства далучыўся да сямейных традыцый. Пасталеўшы, Павел пачаў пошук свайго стылю, захоўваючы пры гэтым традыцыі мастацтва Масленікавых. У яго творчай манеры бачны сінтэз экспрэсіўнага эцюднага почырку, характэрнага для яго дзеда, і строгай кампазіцыі, выразнага малюнка, прапрацоўкі дэталяў, уласцівых карцінам бацькі.

На выстаўцы ў Нацыянальным гістарычным музеі прадстаўлены работы з сямейнай калекцыі. Гэта карціны Паўла Масленікава, напісаныя з 1970 да 1980 года, а таксама работы Уладзіміра і Паўла, створаныя з 2012 да 2018 года.

**Варвара ГОМАН.**

Спытайце пра радзіннае

# АД ЧАГО «АДКУПІШСЯ» ГРАШЫМА?

**Пытанне-разважанне нашых дапытлівых чытачоў: «Падчас пахавання на могілках не раз даводзілася назіраць за спрэчкамі і родных, і чужых людзей: хто павінен кідаць у магілу грошы і ці трэба гэта рабіць увогуле? Адкуль з'явілася гэта традыцыя?»**

Грошы заўсёды выклікалі велізарную цікавасць у чалавека. Здаўна яны былі знакам багацця і служылі прадметам абмену, выкупу, дарэння. У той жа час у народным асяроддзі да грошай было даволі стрыманае стаўленне. **Адно з «залатых» правіл народнай культуры папярэджвае: ніколі не падбірайце грошы на скрыжаванні дарог, бо менавіта імі «адкупляюцца» ад цяжкіх хвароб і розных бед.**

Даволі часта грошы, а дакладней манеты, выступалі як адзін з рытуальных прадметаў у сямейна-родавай і каляндарнай абраднасці ўсходніх славян. Напрыклад, каб быць з «чыстым» тварам, на Вялікдзень мыліся «праз серабро», г. зн. у ваду клалі сярэбраную манету.

Грошы, манеты выкарыстоўваліся ў радзінных абрадах. Падчас адведак парадзіхі і немаўляці жанчына павінна была прынесці ў хату палатна на «пялёнкі» і некалькі манет. Пры першым рытуальным купанні дзіцяці ў ночвы клалі медную або сярэбраную манету. Грошы былі абавязковым складнікам і ў абрадах вяселля. Сярэбраную манету запякалі ў караваі. Калі пачыналі яго дзяліць, то першымі звычайна звалі бабулю з дзедам або родных бацькоў, а тыя сыпалі на талерку жменю манет і пры гэтым прыгаворвалі: «Дорым жменю медзі, каб дзеці былі як мядзведзі!»

Без грошай не абыходзілася будаўніцтва хаты і яе «ажыўленне». Так, у падмурак або бервяно трэцяга вянка ў будучым пакуце абавязкова «закладвалі» адну-дзве манеты і прыгаворвалі: «Кацiся ў кут, серабро, у хату на дабро». А падчас улазін, ведаючы, што новая пабудова, паводле вераванняў нашых продкаў, абавязкова запатрабуе «ахвяру», разам са збожжам на падлогу ва ўсе куты кідалі і некалькі манет, пры гэтым казалі так: «Выкупляю хату не людзьмі, а грашмі».

Манеты былі абавязковым атрыбутам і ў час пахавання. Калі нябожчык адкрываў вочы, яму на павекі клалі манеты. Падчас пахавання **родныя памёрлага першай і другой ступені сваяцтва павінны былі кідаць у магілу грошы (манеты) (варыянт: клалі ў труну), каб «выкупіць» перапраўу на той свет.** Усе астатнія кідалі ў магілу па тры жменькі зямлі.

У адносінах да грошай былі сфарміраваны шматлікія рэгламентацыі. Нашы продкі верылі ў тое, што, парушаючы вызначаныя абмежаванні, можна назаўжды «страціць» поспех або, як казалі ў старажытнасці, «спор», і дабрабыт сям'і пойдзе на змяншэнне. Напрыклад, забаранялася рабіць грашовыя разлікі пасля заходу сонца, у панядзелак і вялікія гадавыя святы; даваць міласціну тымі грашыма, якія атрымалі на рэшту ад пакупкі хлеба або солі, каб не жыць у галечы, пры гэтым старыя людзі падказвалі: давайце міласціну толькі тады, калі ідзяце ў храм; казаць, што ў хаце зусім няма грошай, нават калі іх і сапраўды вельмі мала, бо лічылі, што грошы «пакрыўдзяцца» і пакінуць хату назаўжды. Мудрыя людзі давалі параду: каб грошы не пераводзіліся, неабходна выпрацаваць у сябе прывычку аддаваць левай рукой, а браць — правай.

Як лічылі продкі, можна «дапамагчы» памножыць сваё багацце. Здаўна вядомы звычай кідаць грошы (манеты) у крыніцу каля культавых збудаванняў: капліц, храмаў, манастыроў — у надзеі на паляпшэнне свайго дабрабыту. З гэтай жа мэтай раілі, убачыўшы справа ад сябе малады месяц, паказаць яму манету. Для гэтага ж, пачуўшы ўпершыню вясной зязюлю, трэба патрэсці дробяззю (манетамі) у кішэні; пералічыць усе наяўныя ў хаце грошы на Каляды або Вялікдзень, падчас святочных службаў у храме абавязкова трымаць у кішэні троху грошай.

І як тут не прыгадаць адну сустрэчу на курсах павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры. У першым радзе сядзела жанчына, якая шмат у чым сумнявалася, а ў канцы сустрэчы расказала, што ў яе сям'і яшчэ ад прабабулі перадаецца такі звычай: «Штогод галоўная жанчына роду (маці або бабуля), якая збірае ўсіх на Раство Хрыстова, павінна паставіць на стол запечанага карпа і кожнаму даць па некалькі лускавінак з гэтага карпа. Гэтыя лускавінкі кожны з нас будзе насіць у кашальку да наступнага года. Я стала дарослай, у мяне двое дзяцей, ужо унукі. Кожны год я раблю так. Даю кожнаму гэтыя лускавінкі ад карпа, каб у іх ніколі не пераводзіліся грошы». Як кажуць, хочаце — верце, хочаце — праверце!

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*


**ОАО «МАПИД» приглашает всех желающих принять участие в торгах (аукционе) по продаже неиспользуемой бывшей в эксплуатации техники – автомобиль Volkswagen Transporter**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск ул. Р. Люксембург, 205, каб.17. Окончание приема заявлений 28.02.2019 г. в 10.30.

Более подробная информация об аукционе на сайте www.mapid.by, по телефону 8(017) 397-57-32. Аукцион состоится 28.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб.17.

Наименование предмета торгов (аукциона), начальная цена (с НДС):

Лот № 1 – автомобиль Volkswagen Transporter, 2003 г. в., цена – 14 541,07 руб. с НДС;

Победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязуется возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также затраты на оказание услуг по независимой оценке движимого имущества.

УНП 100008115



**Дочернее строительное унитарное предприятие «Кореличская межхозяйственная передвижная механизированная колонна – 152» извещает о продаже:**

| Предмет торгов | Начальная цена без НДС, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – автобус-вагон (wagon) PAZ-32053, год выпуска 2008 г., регистрационный знак АВ 2007-4, инвентарный номер 6018** | 3 633,52 | 363,35 |
| **Организатор торгов:** ООО «АФК КАПИТАЛЪ», 224030, г. Брест, ул. Советская, 76 (ликвидатор ГП «Кореличская МПМК-152») | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка:** УНП 290504550, р/с BY65 ALFA 3012 2109 5200 5027 0000 в ЗАО «АЛЬФА-БАНК», г. Минск, СВИФТ-ALFABY2X, УНП 101541947, ОКПО 37526626 | | |
| Для участия в аукционе необходимо предоставить: | | |
| 1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме | | |
| 2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов | | |
| 3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) | | |
| 4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) | | |
| 5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) | | |
| 6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя | | |
| 7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность | | |
| * Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта | | |
| Аукцион состоится 11 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Советская, 76 | | |
| Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162)-530363, 8 (029) 7263344 | | |
| Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Советская, 76 в рабочие дни с 9.00 до 17.00 | | |
| **Последний день приема заявлений – 8 февраля 2019 г. до 16.00** | | |



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже автотранспортной техники, принадлежащей РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт» (Продавец), находящейся по адресу: Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9**

| Номер и наименование лота | Начальная цена, бел. руб. (без учета НДС) | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1, состав:** 1. Грузовой специальный подъемник гидравлический ГАЗ 33023, Y391MS21270008102. Г. в. – 2007. 2. Полуприцеп-цистерна ППЦ 30, Y39PPC30080010024. Г. в. – 2008 | 12 044,82 | 2 408,96 |
| **Лот № 2, состав:** 1. Седельный тягач MAZ-MAN 543268, Y3N54326850000726. Г. в. – 2006. 2. Полуприцеп-цистерна PPC-24, Y39PPC24090010004. Г. в. – 2009 | 24 960,71 | 4 992,14 |
| **Лот № 3, состав:** 1. Седельный тягач MAZ 54326 8, Y3N54326850000723. Г. в. – 2005. 2. Полуприцеп-цистерна MAZ 9919, Y3M99190070000854. Г. в. – 2007 | 16 671,57 | 3 334,31 |
| **Лот № 4, состав:** 1. Седельный тягач MAZ-MAN 642368, Y3N64236880000068. Г. в. – 2008. 2. Полуприцеп-цистерна МАЗ 9919 00, Y3M99190070000847. Г. в. – 2007 | 26 563,52 | 5 312,70 |
| **Лот № 5, состав:** 1. Седельный тягач МАЗ 642205, кузов (рама) Y3M64220570002065. Г. в. – 2007. 2. Полуприцеп-цистерна ППЦ 30, Y39PPC30080010026. Г. в. – 2008 | 15 155,75 | 3 031,15 |
| **Лот № 6, состав:** 1. Седельный тягач MAZ-MAN 543268, Y3N54326850000724. Г. в. – 2005. 2. Полуприцеп-цистерна PPC-30, Y39PPC30080010023. Г. в. – 2008 | 23 093,13 | 4 618,63 |

**Аукцион состоится 14.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже автотранспортной техники (Лот №___), принадлежащей РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт», проводимом 14.02.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 12.02.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Рыжий Михаил Владимирович, тел. +375 33 604-47-23. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.08.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Скажыце, доктар...

# АКУЛЯРЫ НЕ НАШКОДЗЯЦЬ

## Проста іх трэба правільна падабраць

**Па даных Міністэрства аховы здароўя, за апошнія пяць гадоў захваральнасць вачэй у дзяцей вырасла на 18 %. У той жа час распазнаць такія праблемы ў малых бывае складана: яны або не скардзяцца, або не могуць дакладна сфармуляваць свае сімптомы. Таму бацькам варта быць надзвычай уважлівымі. У афтальмалогаў дыягностыка і кантроль за хваробамі таксама набываюць асаблівае значэнне. Ці праўда, што сучасныя дзеці год ад году бачаць усё горш? І якую ролю ў гэтым адыгрываюць сучасныя гаджэты? Ці можна дзецям насіць лінзы? Якія міфы пра акуляры самыя распаўсюджаныя? Пра гэта мы пагутарылі з афтальмолагам Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы Таццянай МАЛЕЙ.**

***— Лічбы сведчаць, што зрок у дзяцей пагаршаецца...***

— І гэта глабальная праблема. Раней нагрузка ў школе была меншай, дзеці не карысталіся гаджэтамі з 2—3-гадовага ўзросту, мульцікі глядзелі адзін раз на тыдзень — па тэлевізары. Павышэнне зрокавай нагрузкі садзейнічае таму, што насельніцтва становіцца блізарукім. Такім чынам наш арганізм прыстасоўваецца да работы зблізку. Існуе нават такое меркаванне, што блізарукасць да трох дыяптрый паступова стане нормай. Набываюць блізарукасць нават дзеці, у якіх няма прыроджанай да яе схільнасці — у некалькіх пакаленнях іх продкі не насілі акуляры. Дзіця цікавілася камп'ютарамі, вырасла, стала, напрыклад, праграмістам, 8 гадзін у дзень праводзіць перад маніторам. І гэта вельмі ўплывае на зрок. Нават у дарослых ва ўзросце 30—40 гадоў узнікае першасная блізарукасць, як толькі яны пачынаюць пастаянна працаваць за камп'ютарам.

***— Якія захворванні ў дзяцей сёння найчасцей сустракаюцца? І як бацькам зразумець, што варта звяртацца да спецыяліста?***

— Найбольш распаўсюджаны дыягназ — блізарукасць, калі дзіця добра бачыць зблізку і дрэнна — удалечыні. У яго не ўзнікае праблем пры рабоце з падручнікам, сшыткам, тэлефонам — яны з'яўляюцца пры праглядзе тэлевізара, таксама дзіця не бачыць інфармацыі на класнай дошцы. На яго могуць скардзіцца знаёмыя, бо такое дзіця не вітаецца з наваколльнымі. Гэта не значыць, што яно дрэнна выхавана, яно проста не бачыць. На такія праяўленні павінны звярнуць увагу бацькі і ісці да ўрача. Нярэдка сустракаецца спазма акамадацыі. Гэта яшчэ не хворыя дзеці, але праблемы не за гарамі: іх вочы ўжо стомленыя. Гэта важна, калі ў сям'і ёсць схільнасць да блізарукасці. Калі хтосьці з бацькоў мае гэта захворванне, рызыка яго ўзнікнення ў дзіцяці — 25 %, калі абое — 50 %. Але спазму акамадацыі ў стане распазнаць толькі спецыяліст. Таму варта раз на год да яго звяртацца.

***— Дзецям, якія носяць акуляры, варта правярацца яшчэ часцей?***

— Так, ім абавязкова трэба праходзіць агляд праз шэсць месяцаў. Правяраецца сятчатка, вызначаецца, ці падыходзяць акуляры, бо блізарукасць часта прагрэсуе — на працягу года яна можа вырасці на дыяптрыю і нават больш. Важна, каб такія дзеціназіраліся ў афтальмолага, бо ім можа спатрэбіцца неадкладная дапамога.



***— Якія яшчэ праблемы можна выявіць падчас агляду?***

— Мы не толькі правяраем вастрыню зроку, але і робім агляд вочнага дна, таксама вызначаем рэфракцыю. Гэта дапамагае выявіць невялікую блізарукасць ці дальназоркасць, і такое дзіця трэба назіраць. Праблемы пры рабоце зблізку могуць суправаджацца напружаннем вачэй, галаўнымі болямі, святлабоязззю, пачуццём млоснасці. Што датычыцца вочнага дна, то нават у здаровых дзяцей на ім можна выявіць пэўныя асаблівасці. Як на скуры бывае радзімка, так на вочным дне можа быць невус. І яго варта назіраць — такія новаўтварэнні часам тояць анкалагічную небяспеку. У дзетак з добрым зрокам і без афтальмалагічных дыягназаў могуць быць змяненні сасудаў, у прыватнасці іх звужэнне, што можа выклікаць галаўныя болі. У такім выпадку неабходна абследаванне ў неўролага.

***— Ведаю, што вы аб'ехалі шмат раёнаў у межах праекта «Я бачу!», абследавалі сельскіх школьнікаў. Зрок лепшы ў вясковых ці гарадскіх дзяцей?***

— У нас быў цікавы вопыт: мы прыехалі ў аддаленую вёску ў Маларыцкім раёне і вельмі здзівіліся — большасць дзяцей здаровыя. Высветлілася, што ў дзяцей там проста няма спосабу зайсці ў інтэрнэт, таму і праблем са зрокам няма.

***— Пры выяўленні захворванняў вачэй бацькі ахвотна набываюць акуляры?***

— Летась мы выпісалі ў межах праекта 1360 рэцэптаў на акулярную карэкцыю, і 993 дзецям бацькі набылі акуляры. Гэта добры паказчык. Нежаданне набываць акуляры некаторыя тлумачыць тым, што яны быццам бы выклікаюць прывыканне, пагаршаюць зрок, узмацняюць блізарукасць. Гэта распаўсюджаныя міфы. На самай справе правільна падабраныя акуляры не нашкодзяць. Калі дзіця мае патрэбу ў карэкціроўцы зроку, яго вочы пастаянна знаходзяцца ў напружанні. І такое празмернае напружанне вядзе да прагрэсавання блізарукасці.

***— Дзеці не саромеюцца насіць акуляры?***

— Некаторыя, наадварот, нават расстройваюцца, што ім іх не прапісалі. Сёння шмат прыгожых аправаў, ёсць кантактныя лінзы.

***— З якога ўзросту можна выкарыстоўваць лінзы?***

— З моманту, калі дзіця можа з імі абыходзіцца: усведамляе, калі іх варта знімаць і што лінзы неабходна класці ў кантэйнер з растворам, ведае, што іх трэба мяняць праз нейкі час.

***— Ці патрэбны пры гэтым акуляры?***

— Безумоўна. Бо ў ветранае надвор'е, калі паднімаецца пясок, нашэнне кантактных лінзаў небяспечнае. Яно супрацьпаказана, калі ўзнікаюць прастудныя захворванні, павышаецца тэмпература. У такіх выпадках варта выкарыстоўваць акуляры. У той жа час кантактныя лінзы маюць шэраг перавaг. Яны паляпшаюць дзеянне перыферычнай сятчаткі, у той час як у акулярах асноўная работа — праз цэнтр вока. Кантактныя лінзы незамяняльныя пры некаторых відах работ і не ствараюць абмежаванняў пры занятках спортам. Але, паўтаруся, мець акуляры абавязкова.

Карысна ведаць

# КАЛІ ГАЛАЛЁДЗІЦА СТАВІЦЬ ПАДНОЖКУ

**Зімовае надвор'е працягвае выпрабоўваць нас на стойкасць, сіноптыкі нават аб'яўляюць жоўты ўзровень небяспекі па прычыне галалёдзіцы. Выпадковае падзенне на цвёрдую паверхню ці нават няўдалая спроба ўтрымаць раўнавагу могуць прывесці да вывіху ці расцяжэння звязак. А то і да пералому. Такія траўмы могуць балець месяцамі, не даючы спакою ні днём, ні ўначы. Аб тым, хто знаходзіцца ў зоне рызыкі ў галалёдзіцу, як правільна перамяшчацца па непасыпанай дарозе і чаму ў гэты час непажадана займаць рукі сумкамі, расказаў артапед-траўматолаг 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Сяргей ПУШКАРОЎ.**

***— Сяргей Гур'евіч, у невялікіх раённых цэнтрах бальніца і паліклініка, як правіла, знаходзяцца побач, і, прыходзячы туды з траўмай, памыліцца цяжка. А куды трэба звяртацца ў горадзе: ехаць у спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы або прымуць у паліклініцы?***

— У кожнай паліклініцы вядзе прыём траўматолаг. І, атрымаўшы любую траўму, у тым ліку і галалёдную, звяртацца трэба да гэтага спецыяліста. У выхадныя ці святочныя дні ў кожным раёне працуе паліклініка. У Фрунзенскім раёне Мінска, напрыклад, гэта 2-я цэнтральная раённая паліклініка. Таксама сюды можна звяртацца з траўмамі ў вячэрні і начны час — з васьмі вечара да васьмі раніцы. Ёсць яшчэ і спецыялізаваныя ўстановы. Гэта 6-я гарадская клінічная бальніца, РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, Гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі, Мінская абласная клінічная бальніца ў Бараўлянах. Усе яны прымаюць пацыентаў з траўмамі.

***— Гэтыя ўстановы можна выбраць самастойна?***

— Кожная паліклініка замацаваная за пэўнай бальніцай. Неабходную экстранную дапамогу вам акажуць у любой медыцынскай установе. А вось далей накіруюць у спецыялізаванае аддзяленне. Калі гэта, скажам, траўма кісці, то пацыента адпраўляюць на машыне хуткай дапамогі ў 6-ю клінічную бальніцу, якая на іх спецыялізуецца. З чэрапна-мазгавымі траўмамі — у іншую ўстанову.

***— А калі здарылася траўма далёка ад месца жыхарства, можна звярнуцца ў найбліжэйшую паліклініку?***

— Натуральна. Вам акажуць першую дапамогу: наложаць лангету, зробяць здымкі і накіруюць далей назірацца ў траўматолага па месцы жыхарства, калі пералом без зрушэння. Калі пералом са зрушэннем, то пацыента адпраўляць у клініку, бо яго наступствы ліквідуюцца пад наркозам. У любым выпадку першую дапамогу вам павінны аказаць у любой установе аховы здароўя незалежна ад вашай рэгістрацыі. Калі звяртаецца замежны грамадзянін, дапамога платная.

***— Якія асноўныя траўмы падчас галалёдзіцы?***

— Найчасцей ламаецца прамянёвая косць запясця: чалавек падае, рэфлекторна выцягвае наперад руку і прызямляецца на яе. Таксама пакутуюць перадплечча, шыйка плечавой косці, локцевы адростак і вельмі часта — шчыкалатка.

***— У пажылых людзей часта здараюцца пераломы шыйкі сцягна...***

— Так. У гэтай сітуацыі мы накіроўваем іх на машыне хуткай дапамогі ў клініку. Там, у залежнасці ад стану хворага, выбіраюць тактыку далейшага лячэння.

***— Што мы павінны памятаць, выходзячы ў галалёдзіцу на вуліцу?***

— Перасоўвацца трэба невялікімі крокамі. Пажылым людзям нельга спяшацца, збягаць з абледзянелых лесвіц, з іх трэба сыходзіць бокам, трымаючыся за поручань. Калі не пасыпаны дарогі, па лёдзе трэба ісці плаўным лыжным крокам, не адрываючы стапу ад паверхні. Тады шанцаў не ўпасці больш. Некаторыя раяць згрупавацца, калі пачынаеце падаць. На самай справе не паспявае чалавек падумаць, што трэба згрупавацца, і падае звычайна на спіну, ударяючыся галавой, ці на рукі. Толькі спартсмен можа згрупавацца своечасова. Пажадана, канешне, падаць на бок, не выстаўляючы рукі.

***— Якім павінен быць абутак?***

— Ёсць розныя спосабы засцерагчыся ад падзення з дапамогай пластыру або наждачнай паперы, якія наклейваюць на абутак. Пажадана, каб падэшва была рыфленая. Жанчынам лепш адмовіцца ў такое надвор'е ад абутку на высокіх абцасах. Яны павінны быць як мага ніжэйшымі і шырэйшымі. Але калі лёд пад снегам, абутак не адыгрывае вялікай ролі.

***— Што яшчэ мае значэнне?***

— Вага цела. Калі яна вялікая, пажадана, канешне, хадзіць з палкай. Худзенькі ўпадзе — нічога, як правіла, не зламае, устае і ідзе далей. А поўны чалавек абавязкова траўмуецца, асабліва калі на руку падаць.

Усім трэба ўважліва паводзіць сябе, не бегчы за аўтобусам ці ў краму, не набіраць вялікія сумкі, як пажылыя жанчыны гэта часам робяць. Калі абедзве рукі занятыя сумкамі, трымацца няма за што. Рукі павінны быць свабоднымі — яны ў выпадку чаго дапамогуць утрымаць страчаную раўнавагу. А ўвогуле, па магчымасці ў галалёдзіцу лепш зусім не выходзіць з дому.

***— У пажылых людзей рызыка атрымаць траўму вышэйшая?***

— Так. У галалёдзіцу траўмуюцца пераважна людзі пасля 45—50 гадоў. З моладзі да нас звяртаюцца тыя, хто любіць зімовыя экстрэмальныя заняткі, — сноўбардысты, лыжнікі, хакеісты, наведвальнікі каткоў. Нядаўна была пацыентка, якая вырашыла ўспомніць маладосць і паскакаць на каньках, — атрымала пералом. Свае магчымасці заўсёды важна ацэньваць цвяроза.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

Наш чалавек!

# ЧАРАЎНІЦА З ВЁСАЧКІ МЛЫН

**На пачатку студзеня Ганне Савельеўне Асіпковай споўнілася 80. Некалькі месяцаў таму яна пакінула прытулак у Новазаранскім сельсавеце і пераехала ў горад энергетыкаў, Новалукомль. Але ж у сэрцах землякоў ды прыхільнікаў таленту яна па-ранейшаму засталася сваёй — чараўніцай з вёсачкі Млын, на думку спецыялістаў — адзінай у Еўропе жанчынай, якая так дасканала валодае не зусім жаночым рамяством — разьбой па дрэве.**



Працавітая і сціплая Ганна Савельеўна ніколі не шукала вядомасці: яна прыйшла да майстрыхі сама. Мноства людзей (у тым ліку нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў і касманаўт Георгій Грэчка) пабывала ў яе казачнай хатцы, палюбавалася калекцыяй з шасці дзясяткаў скульптур, падараваных Чашніцкаму гістарычнаму музею.

Карані захаплення майстрыхі — у далёкім пасляваенным дзяцінстве, якое прайшло ў хаце дзядулі. Менавіта там дзяўчынцы адкрыўся свет прыгажосці. Яна як толькі магла адлюстроўвала яго на абрыўках старых шпалераў, газет, тканін. Папера, фарбы, нават алоўкі былі недаступнай раскошай. Аднак вяскоўцы ўсё роўна разгледзелі талент дзіцяці і стараліся падтрымаць яго. Кіраўнік мясцовага рыбгаса падарыў мастачцы, якая яшчэ толькі пачынала, набор каляровых алоўкаў. На тыя маленькія «агрызачкі» прызнаны майстар не забылася да сёння, бо берагла як сапраўдны скарб. З яго дапамогай рыхтавала конкурсныя работы для паступлення ў Віцебскі педагагічны інстытут.

«Курыраваў» гэту падрыхтоўку любімы дзядуля. Каляровай гамы для стварэння сюжэта ў невялікай каробцы не хапала, таму цемру партызанскай ночы «куратар» прапанаваў зрабіць... сажай.

З тых часоў мінулі, здавалася б, дзесяцігоддзі, але млынская ўмеліца дагэтуль помніць, як весялілася прыёмная камісія, разглядаючы яе творчасць.

Між тым студэнткай яна ўсё ж стала і ў родныя мясціны вярнулася ўжо дыпламаваным спецыялістам. Ды якім! Усе, хто вучыўся ў Ганны Савельеўны, памятаюць яе незвычайныя ўрокі. Настаўніца праводзіла іх то ў лесе, то на лузе, то на беразе возера і бачыла, што ў паходзе, каля вогнішча самы адчайны неслух рабіўся раптам пакладзістым і адкрываў у сабе столькі талентаў, што хапіла б на цэлы клас...



Вясковы дом, распісаны майстрам.

Педагог ад Бога — у гэтым пераконвае кожная сустрэча, кожная размова з майстрыхай. Неяк яна ўспомніла, як да яе падышла маці былога вучня і паказала ліст, які сын прыслаў ёй з турмы. Шкадуючы аб сваіх памылках, юнак пісаў, што, калі б больш было такіх людзей, як Ганна Савельеўна, ён за краты ніколі не трапіў бы.

Гэтыя словы пажылая настаўніца памятае ўсё жыццё і лічыць найлепшай адзнакай уласнай працы.

Педагогіка і разьбярства ў яе жыцці зніталіся разам. Дзеці з цікавасцю разглядаюць драўляныя фігуркі майстрыхі, якая першыя ўрокі разьбы атрымала ў дзяцінстве. У сялян пасля вайны не было грошай, каб набываць посуд. А таму дзядуля пры святле газніцы, як толькі выдаваўся час, садзіўся выразаць лыжкі, міскі, іншае кухоннае начынне, а ўнучка — з захапленнем назірала за ім ды пакрысе вучылася.

Потым, ужо настаўніцай, яна захоча папрацаваць з дрэвам і ў яе ўсё атрымаецца! Яна будзе паказваць свае работы і бачыць, з якой цікавасцю іх разглядаюць людзі, казаць, што сама добра адчувае дрэва, бачыць у ім вобразы, ведае, што лішняе, — што трэба прыбраць.

Хутка фотаздымкі з фігуркамі, зробленымі млынскай майстрыхай, з'явіліся ў газетах, у вёску паляцелі лісты з усіх куткоў былой вялікай краіны. Адказвала ўсім, каго ўсхвалявала яе творчасць.

Лёс дзякаваў ёй за шчырую працу. Ганну Савельеўну запрасілі на рэстаўрацыйныя работы ў Пецяргоф. Яна адмовілася. У горад на Няве адправіўся яе сын Ігар, які ішоў па слядах маці, як, дарэчы, і ўнучкі.

...Зараз у млынскай майстрыхі такі ўзрост, што можна б і супакоіцца. Але творчасць не адпускае. Ганна Савельеўна не стамляецца бачыць прыгажосць, радаваць людзей новымі творамі, на гэты раз — з карэння. З радасцю адгукнулася і на просьбу настаўнікаў мясцовай школы падрыхтаваць цыкл малюнкаў пра абярэгі. А як жа радуюць вочы распісаныя ёю, часам зусім старэнькія драўляныя хаты!

Вось так і жыве чалавек, па-сапраўднаму аддадзены зямлі, на якой нарадзіўся.

**Ірына ТОРБІНА,**
*г. Чашнікі.*

Так ці не?

## ЧАС ПІЦЬ ЧАЙ... З ВАРЭННЕМ!

**«Мой любімы тэлеканал — «Беларусь 3», але і там у час прагляду перадач вуха рэжуць пэўныя словы. Адкуль, напрыклад, у нашай мове з'явіўся «дзіцёнак»?» — пытае спадарыня Лявончык. «Як перакласці на нашу мову слова «понарошку» і ці правільна казаць «фільм сканчаецца» — пытанні ад Юліі Воўк.**

**На іх, як заўжды, адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. У народнай мове можна сустрэць слова *дзіцёнак*, а вось у літаратурнай назвы маладых істот на -онак, -ёнак не ўжываюцца. Тут адзіна правільным варыянтам з'яўляецца слова **дзіця** (памяншальна-ласкальная форма — дзіця́тка). Досыць часта, дарэчы, узнікаюць праблемы з яго скланеннем. Таму —

**Н.** Хто? — Дзіця.
**Р.** Няма каго? — Дзіцяці.
**Д.** Падарыць каму? — Дзіцяці.
**В.** Любіць каго? — Дзіця.
**Т.** Ганарыцца кім? — Дзіцем.
**М.** Сумаваць па кім? — Па дзіцяці.

2. Слова «понарошку» перакладныя слоўнікі сапраўды не падаюць. Таму, сутыкнуўшыся з ім, многія і не ведаюць, як гэта будзе па-беларуску. Каб адказаць, пачнём спачатку. Паводле «Толкового словаря русского языка» С. І. Ожагава і Н. Ю. Шведавай, «понарошку, нареч. В детской речи: не по-настоящему, нарочно (во 2 знач.). Значыць, па-беларуску можна сказаць **не папраўдзе, назнарок**. У пэўных выпадках можа прыдацца і слова **жартам**:

*Он обижался на сестру как будто несерьезно, понарошку — Ён крыўдзіўся на сястру быццам бы несур'ёзна, жартам.*

3. А зараз — пра кіно. Калі мы задаём пытанні «Што робіць?», «Што рабіць?», то выкарыстоўваем словы **канчаецца (заканчваецца), канчацца (заканчвацца)**, і г. д. Таму гаворым і пішам: *«Пачакай, фільм ужо хутка канчаецца (заканчваецца)», «Любое цярпенне мае ўласцівасць канчацца (заканчвацца)»*. Калі ж можна задаць пытанні *«Што зробіць?», «Што зрабіць?»* і падобныя, то ў дзеяслова з'яўляецца прыстаўка с-: *«Калі ўжо гэты фільм скончыцца?», «Павінен жа некалі скончыцца гэты абсурд!»*.

### У абарону слоў

Сёння папулярнасць у пэўных колах набірае слова *сочыва*, а вось варэнне — зазнае пэўны ўціск; на яго падае цень небеларускасці.

Перасцеражом ад такога падыходу. Нашым дарагім варэннем (маем на ўвазе слова) карысталіся класікі беларускай літаратуры (І. Мележ, І. Шамякін, В. Быкаў, У. Караткевіч і іншыя), было яно і ў 20-я гады. Вось, напрыклад, артыкул з «Расійска-беларускага слоўніка» 1928 года:

варенье — варэньне, канфітуры; *(густое)* павідла.

Такім чынам, ещё варэнне і завіце яго прывычным і «смачным» словам!

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Адрас дапамогі

## ДЗЕЦІ МАЛЮЮЦЬ СОНЦА

**Прыгожы чатырохпавярховы будынак рэспубліканскага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі больш нагадвае дзіцячы санаторый. Аднак...**

— Я працую тут даўно, — кажа медсястра Тацццяна Рабкоўская, — і разам з дзецьмі шмат чаго перажываю. Добра, калі хворыя ідуць на папраўку... У аддзяленні 60—80 пацыентаў з дыягназам лейкоз. У асноўным трэцяй-чацвёртай стадыяй захворвання, паступаюць таксама дзеці з хоспіса. Ім прызначаюць кропельніцы (хіміятэрапію), пераліванне крыві, прэпараты для абязбольвання.

Цэнтр разлічаны на 180 дзяцей, але часам бывае болей. Тут — некалькі аддзяленняў: рэанімацыі, трансплантацыі, аперацыйны блок, дзённы стацыянар...

— Нам, медработнікам, вядома ж, нялёгка даводзіцца, — расказвае Тацццяна Сяргееўна. — Прывыкаем да дзіцячых капрызаў, плачу. Разумеем, што яны непазбежныя, і нам трэба ўмець дараваць: добразычліва выконваць свае абавязкі, нягледзячы ні на што. У цэнтры кругласутачнае дзяжурства, бывае, што часу няма прысесці. Сутыкаемся і з крыўдамі асобных бацькоў. Іх пачуцці таксама зразумелыя: усім хацелася б бачыць сваіх дзяцей здаровымі і шчаслівымі. А тут...

— Хто яшчэ, апроч родных, наведвае хворых? — спытала я ў Таццяны Сяргееўны.

— У цэнтр прыязджаюць навучэнцы Суворараўскага вучылішча з падарункамі, клоўны з забаўляльнымі праграмамі, валанцёры. Для дзяцей такія мерапрыемствы за свята. Яны радуюцца мяккім плюшавым цацкам, лялькам. Шчаслівыя, калі прывозяць канструктары, мазаікі, акварэльныя фарбы.

Медсястра паказала мне дзіцячы пакой, сцэны якога ўпрыгожаны малюнкамі. І ўсе яны сапраўды незвычайныя! Амаль на кожным — сонейка, кветкі, блакітнае неба... Глядзіш на іх і міжволі пачынаеш верыць, што ўсе дзеці клопатам медыкаў і добрых людзей паправяцца, што ў кожнага наперадзе доўгае жыццё.

**Святлана Няронская,**
*г. Мінск.*

Дзякуй!

## Мы зноў вярнуліся ў школу

**Прыходу Новага года, Каляд радуюцца не толькі дзеці, але і дарослыя, пенсіянеры, бо з'яўляюцца дадатковыя нагоды пабачыцца, пагаварыць.**

Вось ужо каторы год для нас, настаўнікаў-ветэранаў, ладзяцца калядныя сустрэчы. Яны адбываюцца ў розных установах адукацыі. Сёлета, напрыклад, нас прымалі ў СШ № 164, дзе дырэктарам Святлана Уладзіміраўна Багдашова і дзе для нас наладзілі экскурсію ў школьны музей, а таксама вялікі канцэрт.  Пасля гэтага былі шчырыя віншаванні ад начальніка ўпраўлення адукацыі Ленінскага райвыканкама Наталлі Генадзеўны Кучынскай, старшыні раённага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Алы Рыгораўны Бакуновіч, старшыні ветэранскай арганізацыі раёна Антаніны Уладзіміраўны Каралёвай. Далі слова і нам. Але ж за тое, што нас не забываюць, што ладзяць сустрэчы і экскурсіі, запрашаюць у тэатр на святкаванне Дня настаўніка, хацелася б падзякаваць яшчэ раз.

**Эмілія Васілевіч, ветэран працы,**
*г. Мінск.*

Весткі з месцаў

## Каб не парывалася сувязь...

**У канцы студзеня ў рамках супрацоўніцтва паміж Чавускімі прыходамі Магілёўскай епархіі і мясцовым выканкамам прайшлі другія рэгіянальныя агульнаадукацыйныя чытанні, прысвечаныя Году малой радзімы.**

Трэба адзначыць, што Чавусы сталі першым райцэнтрам, дзе ўжо другі год праходзіць падобнае мерапрыемства. Праводзяцца яны ў гонар свяціцеля Георгія Каніскага, архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага, які ў XVIII стагоддзі ўзначальваў Магілёўскую кафедру. На чытанні былі запрошаны старшакласнікі, якія маюць схільнасць да вывучэння гісторыі і краязнаўства, настаўнікі, супрацоўнікі раённага краязнаўчага музея, Цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы, прыхаджане Свята-Узнясенскай царквы... Яны з цікавасцю слухалі даклад аб жыцці і дзейнасці мовазнаўца, этнографа, педагога, ураджэнца раёна Івана Іванавіча Насовіча, гістарычны агляд праваслаўных храмаў, капліц, царкоўна-прыходскіх школ, якія існавалі на тэрыторыі павета, пазнаёміліся з выстаўкай духоўнай літаратуры. Такія чытанні, як адзначыў благачынны Чавускай акругі протаіерэй Мікалай Змушко, прыбліжаюць моладзь да сваіх гістарычных і духоўных каранёў, спрыяюць развіццю патрыятызму.

**Валерый Гаўрыш,** *г. Чавусы.*




# ГАРАЧЫ МІНСКІ ЛЁД




Грандыёзнае свята на лёдзе, якое, мабыць, нікога не пакінула абыякавым. Чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні на «Мінск-Арэне» стаў першым дамашнім у гісторыі Беларусі.

Чатыры спаборніцкія дні, чатыры камплекты ўзнагарод, 145 спартсменаў з 34 краін Старога Свету, дзясяткі асабістых рэкордаў і аншлагі на галоўнай лядовай пляцоўцы краіны.

Усе спаборніцкія дні балельшчыкі разам са спартсменамі перажывалі самыя розныя эмоцыі: ад захаплення (калі ў майстроў канькоў атрымліваліся вельмі складаныя элементы) да шкадавання (калі штосьці ў спартсменаў ішло не так).

Сёння чэмпіянат Еўропы — гэта не толькі гісторыя і яркія ўспаміны. Гэта — крок нашай краіны на шляху да новай мэты — чэмпіянату свету! А імгненні яскравага лядовага шоу надоўга застануцца ў нашай памяці.

**Ганна ЗАНКАВІЧ. Фота аўтара.**










*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*



## Извещение о проведении второго повторного аукциона по продаже объектов недвижимости Коммунального унитарного предприятия по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда»

| | |
|---|---|
| Предмет аукциона и его местонахождение | **Лот № 1** – комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: пр-т Индустриальный, 15, 15/1, 15/2, 15/3, 15/4, 15/7, 15/8, 15/9, 15/10, 15/11, 15/12, 15/13, в г. Сморгони Гродненской области |
| Начальная цена предмета аукциона | 1 961 904 руб. 84 коп. (в том числе НДС 20 % 326 984 руб. 14 коп. ) |
| Продавец недвижимого имущества | Коммунальное унитарное предприятие по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда».<br>Адрес: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301 (УНП 500213060), тел.: +375(29) 866-10-00 (МТС), +375(1592) 469-42 |
| Характеристика объектов | **Капитальные строения с инв. №№:**<br>**443/С-18681 – здание главного производственного корпуса** – 1990 г. п., одноэтажное панельно-кирпичное (КТП–1, КТП–2, КТП–3), S общ. – 20211,9 кв. м; **очистные сооружения; БСЦ; галерея; КПП; ворота; забор**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ИЧУПП «Электроинжиниринг» Мазурина В. И. – 65,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.03.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 1668,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ИП Насекайло З. Ф. – 144,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 16.07.2020 г.<br>ООО «Вендмирус» – 64,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18682 – здание склада готовой продукции** – 1990 г. п., одноэтажное асбестоцементное, S общ. – 11860,0 кв. м; **склад закрытый; склад открытый.** Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Бальга» – 100,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.12.2018 г.<br>**443/С-18683 – здание административно-бытового корпуса** – 1990 г. п., трехэтажное кирпично-панельное, S общ. – 2849,0 кв. м; **с подвалом**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Норд Транс Логистик» – 12,5 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 669,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Нанотехновак» – 108,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 07.10.2019 г.<br>ООО «Вендмирус» – 17,6 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «Групп Эверс» – 17,8 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 04.12.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18684 – здание складского блока с зарядной** – 1990 г. п., одноэтажное кирпично-шиферное, S общ. – 1198,8 кв. м. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ЧПУП «МеханикЭнерго» – 329,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.02.2019 г.<br>**443/С-18685 – бытовое здание склада готовой продукции –** 1994 г. п., одноэтажное панельное, S общ. – 57,0 кв. м;<br>**443/С-18671 – градирня –** 1990 г. п., одноэтажное шиферное, S общ. – 40,0 кв. м;<br>**443/С-21676 – здание склада цемента –** 1990 г. п., одноэтажный кирпичный, S общ. – 343,5 кв. м; **подвал ж/б**; **рампа**; **опорные конструкции под силоса**; **силоса**;<br>**443/С-21677 – склад заполнителей –** 1990 г. п.; в составе **транспортировочная, галерея, галерея, прием песка, приемочный бункер, транспортировочная, прием керамзита и щебня, приемочный бункер, транспортировочная, склад заполнителей, техническое здание, натяжная станция, передаточная, приемный отдел керамзита и щебня, техническое здание;**<br>**443/С-21661 – здание склада ГСМ и эмульсола** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 62,1 кв. м;<br>**443/С-21662 – компрессорная –** 1990 г. п., двухэтажная железобетонная, S общ. – 602,3 кв. м; **подвал бетонный;**<br>**443/С-21663 – отделение приготовления химдобавок** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 167,7 кв. м; **подвал ж/б;**<br>**443/С-21664 – здание КПП** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 9,6 кв. м;<br>**443/С-21665 – внутриплощадочные и внеплощадочные электросети:** протяженность линейного сооружения – 389,3 м;<br>**443/С-21666 – автодороги,** протяженность – 1920,4 м; бетон, асфальтобетон;<br>**443/С-21667– сети связи и сигнализации,** протяженность линейного сооружения – 14,0 м;<br>**443/С-21668 – сети водопровода**, протяженность линейного сооружения – 66,5 м;<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 694,00 м, расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0328 по бух. учету);<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 826,80 м расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0329 по бух. учету) |
| Информация о земельном участке | Площадь земельного участка с кадастровым номером 425650100001004336 – 9,4471 га. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности |
| Условия использования земельных участков | |
| Ограничения по использованию земельного участка | Право постоянного пользования |
| Условия проведения аукциона | *Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона. Условия оплаты по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее* ***20*** *рабочих дней с момента подписания протокола аукциона* |
| Публикации извещений о проведении торгов по продаже имущества КУП «Сморгонская Надежда» | Газета «Звязда» от 11.12.2018, от 30.01.2019 |

1. **Аукцион состоится 11 февраля 2019 года в 12.00 по адресу: 231044, Гродненская обл., г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301**. Заявки принимаются с 9.30 до 17.00 по электронной почте nisabel@mail.ru, а также по адресу: г. Гродно, 230023, а/я 174. Последний день подачи заявлений – **10 февраля 2019 года до 24.00**.

2. **Организатор аукциона** – ***Индивидуальный предприниматель Бойкова Наталья Николаевна, почтовый адрес: 230023, г. Гродно, а/я 174, тел.: +375 (29) 866-10-00 (МТС), +375 (152) 68-57-55 (оф.) (время работы с 9.30 до 16.00, кроме выходных и праздничных дней), e-mail: nisabel@mail.ru.***

3. **Порядок ознакомления с имуществом, являющимся предметом торгов,** – до окончания срока приема заявок на участие в торгах можно ознакомиться с информацией об имуществе, составляющем предмет продажи (пн.–пт. с 9.30 до 17.00) по адресу: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15 (тел. +375 (29) 633-74-08).

4. **Место нахождения предмета аукциона** – Гродненская область, г. Сморгонь, проспект Индустриальный, д. 15. Земельный участок с кадастровым номером 425650100001004336, площадь – 9,4471 га, назначение – Земельный участок для обслуживания зданий ликвидированного завода КПД.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 16 от 8 января 2013 г. Аукцион является открытым.

5.1. Порядок проведения торгов: шаг аукциона составляет 5 % от начальной цены предмера аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

6. **Размер задатка для участия в аукционе – 200 000 руб. 00 коп.** Задаток перечисляется на р/с BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда», УНП 500213060.

7. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на *текущий (расчетный) счет продавца №* BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда», УНП 500213060;

копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством) – **для юридических лиц – резидентов Республики Беларусь;**

копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона – **для индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь;**

нотариально удостоверенная доверенность – **для представителя гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя;**

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для юридического лица, иной организации – нерезидента Республики Беларусь;**

легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь;**

легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя.**

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

5. Организатор торгов после опубликования извещения вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## об открытом повторном аукционе по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Кобринском районе Брестской области 28 февраля 2019 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Дачная, 12, д. Большие Лепесы, Буховичский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380601601001096 | 0,1485 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 7000 | 700 | 1366,35 |
| 2 | ул. Малиновая, 6, д. Патрики, Хидринский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124385506601000445 | 0,1573 | Обеспеченность (возможность) подключения электроснабжения | 3100 | 310 | 1302,75 |
| 3 | ул. Малиновая, 8, д. Патрики, Хидринский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124385506601000446 | 0,1589 | Обеспеченность (возможность) подключения электроснабжения | 3200 | 320 | 1302,75 |
| 4 | ул. Дружбы, 51А, д. Быстрица, Залесский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124382500601000429 | 0,1310 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения | 4000 | 400 | 1739,85 |

**Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ**

**Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 28 февраля 2019 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням**
**Последний день приема заявлений – 22 февраля 2019 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа земельных участков осуществляется гражданам Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

На основании подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, предоставленному для строительства одноквартирного жилого дома в районах индивидуальной жилой застройки, подлежат возмещению в порядке, установленном положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. № 298.

Затраты, возмещаемые победителем аукциона, являющимся застройщиком жилого дома, возмещаются при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома либо до ввода в эксплуатацию жилого дома с учетом индексации.

Величина затрат, возмещаемых гражданином, являющимся застройщиком жилого дома, при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома по состоянию на декабрь 2018 года составляла:
– по лоту № 1 – 2770,27 рубля;
– по лоту № 2 – 4727,83 рубля;
– по лоту № 3 – 4754,96 рубля.

По лоту № 4 затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку не возмещаются.

Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## об открытом повторном аукционе на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кобрин Брестской области 28 февраля 2019 года в 11.30

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Настасича | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007857 | 0,0034 | Сети газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения и канализации проходят по улице | 2000 | 200 | 2051,72 |

**Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ**

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 28 февраля 2019 года в 11.30 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 22 февраля 2019 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.

К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победителем аукциона в обязательном порядке вносится плата за право аренды и ежегодная арендная плата за земельный участок, находящийся в государственной собственности. При продлении арендных отношений в обязательном порядке вносится плата за право аренды.

Годовая арендная плата на дату проведения аукциона составляет – 20,90 рубля.

Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

*Лупіна ўсіх цытрусавых (мандарыны, лімоны, грэйпфруты) можа стаць натуральным угнаеннем або адпудзіць непажаданых насякомых.*

# АПЕЛЬСІНАВЫЯ СКУРКІ Ў САДЗЕ І АГАРОДЗЕ

### Угнаенне

Лупіна цытрусавых змяшчае калій, фосфар і іншыя мікраэлементы. Апельсінавыя скуркі раяць проста нарэзаць і закопваць у зямлю на 5-сантыметровую глыбіню. Калі ёсць час і жаданне, лупіну з невялікай колькасцю вады можна здрабніць да стану кашыцы. І прыкопваць у такім выглядзе, бо здробненая арганіка засвойваецца хутчэй. Існуе меркаванне, што падкормкі цытрусавай лупінай падкісляюць глебу. На самай справе, каб хоць крыху змяніць pH, спатрэбіцца не адна тона лупіны і не адзін год падкормкі. І ўсё ж для перастрахоўкі рэкамендуецца закопваць «апельсінавае ўгнаенне» толькі пад культуры, якія добра растуць на кіслых глебах. Напрыклад, пад шпінат, рэдзьку, рэпу, буякі або бружмель.

Самы хуткі і зручны спосаб выкарыстання апельсінавай лупіны на карысць агарода — яе кампаставанне. Калі вы робіце кампост па ўсіх правілах, чаргуючы азоцістыя і вугляродзістыя пласты, то цытрусавыя скуркі павінны адправіцца ў азоцістыя (зялёны) разам з травой і гноем. А вось тым, у каго над стварэннем кампосту працуюць чарвякі, апельсінавыя скуркі дадаваць не варта. Чарвякі іх не любяць.

### Сродак для адпуджвання катоў і мурашак

Нашы любімыя гадаванцы часам любяць парыцца ў градках. І як на злосць, менавіта ў тых, куды толькі што пасеялі насенне. Але варта раскласці побач свежыя скуркі цытрусавых, і непрыемнасцяў можна пазбегнуць. Рэзкі пах коцікам не па душы! Некаторыя дачнікі заварваюць апельсінавыя скуркі кіпнем і паліваюць астылым адварам градкі, ад якіх трэба адвадзіць кошку.



Мурашкі таксама не паважаюць апельсіны. Гэтым карыстаюцца садоўнікі, якія жадаюць пазбавіцца ад насякомых беспечнымі метадамі. Перш за ўсё трэба прыгатаваць вадкую кашу з цэдры. Для гэтага здрабняюць у блэндары лупіну ад 2-3 апельсінаў разам са шклянкай цёплай вады. Затым выліваюць атрыманую субстанцыю на мурашнік. Магчыма, давядзецца паўтарыць гэтую працэдуру, перш чым насякомыя пакінуць наседжанае месца.

### Супраць шкоднікаў

Мандарынавая, лімонная і апельсінавая лупіна змяшчае леманен — вуглевадарод, які разбурае ахоўныя пакровы некаторых насякомых. Гэта ўласцівасць асабліва цэніцца земляробамі, якія не прызнаюць хімічныя пестыцыды. Супраць трыпсаў, павуціннага кляшча і тлі ўжываюць настоі цытрусавых скурак.

Вось некалькі варыянтаў іх прыгатавання:

100 грамаў сухіх лімонных скурак настойваюцца ў літры вады 3-4 дні (у цемры);

350 грамаў высушаных цытрусавых скурак замочваюць у цёплай вадзе да набракання. Разам з вадкасцю блэндарам перапрацоўваюць у кашу, якую перакладаюць у літровы слоік. Даліваюць вады і настойваюць 5-7 дзён. Пасля чаго настой працэджваюць, дадаюць сталовую лыжку гаспадарчага мыла. Перад апырскваннем палову шклянкі настою разводзяць у вядры вады;

скурку з 2-3 апельсінаў здрабняюць, заліваюць літрам цёплай вады, а потым тыдзень настойваюць у цемры. Пасля працэджвання разводзяць двума літрамі вады і дадаюць сталовую лыжку вадкага мыла для прыліпання. Прыгатаваным настоем заражаныя расліны апрацоўваюць (апырскваюць або праціраюць лісце) ад тлі 2-3 разы, ад кляшчоў і трыпсаў — 5-6 разоў.

### Ёмістасці для расады

Палавінкі апельсінаў (без змесціва), грунт і насенне — вось усё, што трэба. І ў градку высаджваць зручна: закапаў сеянец проста разам са скуркай — і парадак. Такія натуральныя «кубачкі» падыходзяць для расады, якая: са з'яўленнем другога-трэцяга лісточка будзе пересаджана ў ёмістасці большага памеру; хутка расце і высаджваецца ў грунт праз некалькі дзён пасля ўсходаў (напрыклад, агуркі, кабачкі ці гарбуз).

### Для распальвання

Сухімі апельсінавымі скуркамі можна распаліць мангал, камін або печ. Яны выдатна гараць і струменяць прыемны водар. У такога вогнішча пасядзець нашмат прыемней!

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.00 | 17.46 | 8.46 |
| Віцебск — | 8.55 | 17.31 | 8.36 |
| Магілёў — | 8.50 | 17.36 | 8.46 |
| Гомель — | 8.41 | 17.38 | 8.57 |
| Гродна — | 9.15 | 18.02 | 8.47 |
| Брэст — | 9.09 | 18.08 | 8.59 |

### Месяц

*Апошняя квадра 28 студзеня. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр. Антона, Паўла. К. Марціны, Марціна, Мацея, Себасцьяна, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 30 СТУДЗЕНЯ




**1895** год — нарадзіўся (в. Мышкавічы, цяпер у Кіраўскім раёне) Кірыла Пракопавіч Арлоўскі, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізатар калгаснай вытворчасці, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы.

**1925** год — прынята рашэнне аб стварэнні Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Размешчаны ў Лепельскім, Докшыцкім і Барысаўскім раёнах. Створаны як Дзяржаўны паляўнічы запаведнік у мэтах аховы і размнажэння каштоўных дзікіх жывёл, птушынай дзічыны. Экспедыцыя вучонага-заолага А. У. Фядзюшына пасля Першай сусветнай вайны выявіла тут некалькі асобін мядзведзя, ласёў, дзікоў, глушцоў, белай курапаткі і каля 20 паселішчаў бабра. Гэта паслужыла асновай для стварэння запаведніка. Былі забароненыя паляванне, лоўля рыбы, высечка і сплаў лесу, праведзена высяленне хутароў. У 1994 годзе ўключаны Саветам Еўропы ў лік біягенетычных, у 1995 годзе ўзнагароджаны Еўрапейскім дыпломам за паспяховую работу па захаванні прыродных комплексаў і біялагічнай разнастайнасці, у 1998-м уключаны ў спіс тэрыторый, важных для птушак.




**1975** год — у Мінску адкрыўся кінатэатр «Кастрычнік», адзін з найпрыгажэйшых у горадзе. Будынак пабудаваны па індывідуальным праекце, выкананым інстытутам «Белдзяржпраект».




**1900** год — нарадзіўся Ісаак Восіпавіч Дунаеўскі, савецкі кампазітар, народны артыст Расіі. У 1929—1934 гадах музычны кіраўнік і галоўны дырыжор Ленінградскага мюзік-хола. Найбуйнейшы майстар савецкай масавай песні: «Песня аб Радзіме», «Мая Масква», «Ляціце, галубы». Адзін са стваральнікаў савецкай аперэты: «Залатая даліна», «Белая акацыя». Аўтар музыкі да фільмаў: «Вясёлыя рабяты», «Варатар», «Цырк», «Волга-Волга» і інш. У сваю музыку ўключаў інтанацыі ў тым ліку і беларускіх народных песень, гучанне жалейкі, стварыў апрацоўку беларускай народнай песні «Бульба». Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1955 годзе.

**1930** год — ЦК ВКП(б) зацвердзіў тэкст пастановы «Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі», якая санкцыянавала канфіскацыю маёмасці, масавую высылку на пасяленне ў неабжытыя раёны і іншыя рэпрэсіўныя меры ў дачыненні да «кулакоў». 4 лютага 1930 года была зацверджана інструкцыя ЦВК і СНК саюзным рэспублікам, краям і абласцям аб ускладнені на АДПУ арганізацыі «раскулачвання».

**1945** год — экіпаж падводнай лодкі С-13 пад камандаваннем капітана 3-га рангу А. І. Марынеска патапіў у раёне Данцыгскай бухты нямецка-фашысцкі суперлайнер «Вільгельм Густлаў». На борце лайнера знаходзілася звыш 5000 салдат і афіцэраў, у тым ліку каля 1300 падводнікаў — эліта германскага падводнага флоту.

Дарагую нашу нявестку **Марыну Пятроўну ЛЯЎШУ**, якая працуе завучам у Любчанскай сярэдняй школе, шчыра віншуем з днём нараджэння! Зычым моцнага здароўя, згоды і ладу ў сям'і, поспехаў у працы!

*Няхай табе сонца смяецца,*
*Няхай усё ўдаецца,*
*І хай будзе светлым*
*Кожны твой дзень!*

**З павагай і любоўю твая сям'я.**



## УСМІХНЕМСЯ

— Афіцыянт! Я ўжо дзве гадзіны чакаю квашаніну!

— Усё-ўсё-ўсё, паставілі варыць!

**«Гараджанін» — гэта калі конскі гной для цябе пахне цыркам.**

— Ну, я купіў жонцы машыну, але яна вельмі баіцца ездзіць па горадзе, толькі па маршруце «Дом — работа — дом».

— Трэба было ёй трамвай купіць, у яго яшчэ і перавага на дарозе.

**Калі прыгожых жанчын сёння вакол нашмат больш, чым звычайна, значыць, заўтра з раніцы будзе балець галава.**

Спачатку надакучае піва. Потым смузі. Потым здымаеш з сябе кашулю, голішся, апранаешся ў буцікі. Потым купляеш ёмісты сямейны аўтамабіль. Потым перастаеш працаваць па выхадных. Потым ідзеш у краму «Рыбалоў» і купляеш першую блешню на акуня. Вось і ўсё.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 149.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12